Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КАСТРЫЧНІК 29 1932 г. № 242 (4494)

Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Аўладаць агразоатэхнікай (1 стар.). Канец стабілізацыі капіталізму і пераход да новага туру рэвалюцый і войны (3 стар.).

У дзкаду ўраджаю і калектывізацыі ліквідаваць прарыў па зяблеву (3 стар.).

Па прыкладзе Лагойскага, Заслаўскага, Лельчыцкага і Мсьціслаўскага раёнаў ударнымі тэмпамі адгружаць бульбу Ленінграду (1 стар.).

Заўтра адкрываецца калгасны кірмаш у Менску (3 стар.).

Поўным выкананьнем плянаў бульба і збожжазагатовак сустрэць XV гадавіну Кастрычніка (3 стар.).

Разгортваючы масава - растлумачальную работу — ліквідуем адставаньне аднаасобнага сэктару ў збожжазагатоўках (3 стар.).

Лёзунгі да 15-ай гадавіны Кастрычніка (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ: Бюджэт вайны (1 стар.). «Францыі ўсё, Германіі—нічога» (1 ст.). Рэзкая крытыка французкіх прапаноў (1 стар.).

ПРЫВЕСЬЦІ У РУХ УСЕ ВАГАРЫ!

ПА ПРЫКЛАДЗЕ ЛАГОЙСКАГА, ЗАСЛАЎСКАГА, ЛЕЛЬЧЫЦКАГА І МСЬЦІСЛАЎСКАГА РАЁНАЎ

УДАРНЫМІ ТЭМПАМІ АДГРУЖАЦЬ БУЛЬБУ ЛЕНІНГРАДУ

АЎЛАДАЦЬ АГРАЗОАТЭХНІКАЙ

Дзкада ўраджаю і калектывізацыі, абвешчаная Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б з 28 кастрычніка па 8 лістапада, набывае выключна гаспадарча-палітычнае значэньне. У дні дзкады партыйныя арганізацыі павінны ўзьняць семьдзесяць шырокія пласты насельніцтва на канкрэтнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 29 верасьня.

У выкананьне пастаноў партыі і ўраду мы сур'ёзна, не на словах, а на справе павінны «ад росту гаспадаркі ў шырыню» шляхам пашырэньня пасеўных плошчаў — павярнуць да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці». Павысіць якасьць работы, атрымаць высокія якасныя паказальнікі ва ўсіх галінах сельска-гаспадарчай вытворчасьці — вось задача зарач кожнай парт-арганізацыі.

Нельга больш цярпець пізкай ураджайнасьці як збожжавых, так тэхнічных і кармовых культур. У першай пяцігодцы пад сельскую гаспадарку падвергнена выстарчальная тэхнічная база. Праз арганізацыю буйных калектыўных гаспадарак створаны ўсе магчымасьці для таго, каб у другой пяцігодцы ня толькі дагнаць, але і перагнаць па ўраджайнасьці перадавыя капіталістычныя краіны. Іменна так, а ня інакш ставіць партыйны пытаньне.

Гэта ў сваю чаргу вымушае ва ўсю шырыню паставіць задачу аўладаньня тэхнікай буйнай сацыялістычнай сельскай гаспадарцы, аўладаньне агратэхнічнымі ведамі ў першую чаргу з боку высокага партыйнага, камсамольскага і калгаснага актыву. Нізавыя партыйныя ячэйкі павінны павярнуцца тварам да сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Пры сучасных умовах работы на вёсны кожны сакратар райкому, партыйнай і камсамольскай ячэйкі павінен ведаць, як увесьці севазварот, апрацаваць глебу, увесьці ўтаенае, на якой зямлі якім гатункам пасеяць тую ці іншую культуру.

Дзкада ўраджаю і калектывізацыі ставіць сваёй мэтай пераключыць увесь зямельна-калгасны апарат на практычнае ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы сельскай гаспадаркі, на барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці. У дні дзкады трэба выявіць увесь багаты вопыт перадавых саўгасаў і калгасаў па ўжываньні агратэхнікі, перадаць гэты вопыт адстаючым гаспадаркам. Ускрыць прычыны нізкіх ураджаяў, з усёй бальшавіцкай жорсткасьцю змагацца з «ліваўскай» недасведчанай агратэхнікі, выкарчоўваць бюкультур'е, кісласьць, абломаўшчыну.

Арганізацыя раённых і міжкалгасных сельска-гаспадарчых выставак — самая лепшая форма для наглядкай агітацыі і папулярызацыі дасягненьняў перадавых саўгасаў і калгасаў. А іх дзесяткі, сотні па БССР. Тут-жа, на выстаўцы прапеваць лепшых змагароў за высокі ўраджай, за высока-прадукцыйную жывёлу. Улічваць усе дзелавыя прапановы вопытных гаспадароў. Разам з перадавымі калгаснікамі, рабочымі саўгасаў пачынаць далейшае мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці ўсіх культур і ў першую чаргу вядучай культуры свайго раёну.

Трэба пагадзя правесьці ўсю арганізацыйную падрыхтоўчую работу з тым, каб з 20 лістапада распачаць масавую агратэхнічную партыйнага, камсамольскага і калгаснага актыву. Адчыняць школы, курсы, гурткі, падабраць кіраўнікоў, распрацаваць праграмы, набыць адпаведную літаратуру. У кожным раёне пры райземаддзеле стварыць агразоатэхгабінэты, забясьпечыць іх інструментам, прапаратамі, набываць туды лепшыя экспанаты з сельска-гаспадарчых выставак. Тут патрэбна з боку тэхпрапу НКЗБ большая паваротлівасьць, ініцыятыва, энэргія.

Зараз, як ніколі, адкрываецца вялізнае поле дзейнасьці для дасьледчых сельска-гаспадарчых інстытутаў, вопытных станцый, для ўсяго агратэхнічнага персаналу. 1.490 спэцыялістаў сельскай гаспадаркі налічваецца па БССР, па 6-7 калгасаў—адзін спэцыяліст. Лічба не маленькая. У 1913 годзе на тэрыторыі сучаснай БССР было ўсяго толькі 241 спэцыялістаў.

Перадаць масам свае веды і на практыцы навучыць калгаснікаў, як павышаць ураджайнасьць, на вопытных участках паказаць сілу агратэхнічнай навукі — вось задача кожнага спэцыяліста. Партыйныя арганізацыі абавязаны неадкладна дабіцца такога становішча, каб кожны аграспэцыяліст працаваў па сваім прызначэньні. Вызваліць агранома ад канцылярскай работы, ад складаньня статыстычных зводак, даць яму магчымасьць быць непасрэдна ў масах, у саўгасе і калгасе.

У дні правядзеньня дзкады ўраджаю і калектывізацыі трэба мабілізаваць актыў, калгасныя масы на пасьпяховае завяршэньне ўсіх асенніх сельска-гаспадарчых кампаній. Да кастрычніцкіх сьвят поўнасьцю скончыць зяблева, выкапаць свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай, да 1 лістапада адгрузіць бульбу пралетарскім цэнтрам — пад такімі лёзунгамі павінна праходзіць уся работа ў часе дзкады.

Мы стаім пад простай пагрозай недавыкананьня плянаў па зяблеву. На 25 кастрычніка ўзарана толькі 37 проц. да пляну. Калгасы, саўгасы і аднаасобнікі ніяк павінны ўзьняць 946 тыс. га. Прырост у 90 тыс. га, які дала апошняя пяцідзёўка, нельга лічыць здавальняючым. Лічбы паказваюць, што вакол зяблева не мабілізавана грамадзкая думка, зяблева недасьледваецца, як адзін с самых лепшых агратэхнічных сродкаў па павышэньні ўраджайнасьці.

Пазуль не наступілі замаразкі, трэба скарыстаць усе сілы і сродкі МТС, саўгасаў і калгасаў для ўзмацненьня тэмпаў зяблева. Нагрузіць поўнасьцю трактарны парк, 70 проц. коняй перакінуць выключна на ворыва, пагрозаваць ад вытворчых брыгад акуратнай добраякаснай работы на зяблеве. Дні дзкады ўраджаю і калектывізацыі павінны ператварыцца ў дні масавага штурму па ліквідацыі прарываў на адным з важнейшых участкаў барацьбы за высокі ўраджай — па зяблеве.

Падагульваючы на сельска-гаспадарчых выстаўках, на сходах калгаснікаў, беднякоў і серэднякоў—аднаасобнікаў вынікі 1923 гаспгадачага году, трэба тут-жа пачынаць і канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы 1933 г. Абгаварваць тыповыя севазвароты, рыхтаваць даныя для новага вытворчага гадавога пляну, стварыць насенныя фонды, адрамантаваць с.-г. інвэнтар і г. д.

Пры сьвядомым падыходзе да важнейшых дырэктыў партыі і ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці, пры шырокай мабілізацыі мас, пры разгортваньні сацыялістычнага ўдарніцтва мы зможам дасягнуць больш высокага ўраджаю ў першым годзе другой пяцігодкі.

ПА ПРЫКЛАДЗЕ ЛАГОЙСКАГА, ЗАСЛАЎСКАГА, ЛЕЛЬЧЫЦКАГА І МСЬЦІСЛАЎСКАГА РАЁНАЎ УДАРНЫМІ ТЭМПАМІ АДГРУЖАЦЬ БУЛЬБУ ЛЕНІНГРАДУ

Забясьпечыць гібкае і выразнае кіраўніцтва адгрузкай

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае, што ў ходзе адгрузкі бульбы Ленінграду ўпаўнаважаным Камітэту Загатовак пры СПА па БССР тав. **Бэнэкам** выяўлены наступныя абсалютна недапушчальныя факты бюракратычных адносін да работы.

1. Тав. **Панамароў**—дырэктар Белплодагароднінны праявіў поўнае няведаньне фактычнага становішча ў Бялыніцкім раёне, дзе пры асабістым абсьледваньні з боку тав. Бэнэка выяўлены факты масавага прывозу бульбы калгаснікамі і аднаасобнікамі, якія прасталі з-за адсутнасьці на пункце вагаў і прыёмачных квітанцый—больш сутак. Кіраўніцтва Белплодагароднінны, у прыватнасьці, тав. Панамароў—абсалютна ня ведала аб гэтым факце і прыняла меры толькі пасьля ўказаньня тав. Бэнэка.

Абвясьціць тав. **Панамарову** суровую вымову за адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва работай і няведаньне становішча работы ў раёне.

2. На Жодзінскай ветцы пры асабістым абсьледваньні з боку тав. Бэнэка выяўлена 500 тон бульбы. Тав. **Зялічонак**—дырэктар Белкаапплодагароднінны—таксама праявіў няведаньне наяўнасьці гэтай колькасьці бульбы на Жодзінскай ветцы і ня прыняў своечасовых мер па забясьпячэньні тары для адгрузкі. Апрача таго выяўлена, што некаторая колькасьць бульбы пачала гніць. Толькі пасьля зробленага т. Бэнэкам указаньня, тав. Зялічонак прыняў неабходныя меры.

За падобныя нядбайныя адносіны да сваіх простых абавязкаў—абвясьціць тав. **Зялічонку** суровую вымову.

3. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Бэнэка аб тым, што ім перададзена суду справа аб намесьніку ўпаўнаважанага канторы ЛСПО т. **Калешка**, які паслаў у Бялынічы чатыры цягачы, не забясьпечыўшы іх неабходнай колькасьцю гаручага і змазачнага, у выніку чаго цягачы вымушаны былі прастойваць па дарозе па некалькі разоў, дайшоўшы да Бялынічаў толькі на пяты дзень.

4. За сыстэматычны зрыў адгрузкі бульбы і прастой вагонаў абвясьціць суровую вымову загатоўчаму слуцкага райзагу т. **Жыгмунтовічу**.

5. Прыняць да ведама, што зьнят з работы і аддан пад суд загатоўчык слуцкай канторы Белплодагароднінны т. **Непагодзін**.

ЦК лічыць неабходным давесьці да ведама ўсіх РК КП(б)Б аб гэтых фактах, выяўленых у ходзе работы па адгрузцы бульбы Ленінграду, і ўказаць, што падобныя факты сьведчаць аб бязгоўнай няўважлівасьці раду работнікаў, якія не ўяўляюць сабе ўсёй палітычнай важнасьці работы, што імі праводзіцца.

ЦК лічыць, што РК КП(б)Б абавязаны прымаць неадкладна аднаведныя меры пакараньня ў выпадках выяўленьня падобных фактаў у рабоце па загатоўках у даным раёне, паведаміўшы ЦК.

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(у тысячах тон на 28 кастрычніка)

НАЗВА ЗАГАТОЎЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ	ПЛЯН	Адгружана з пачатку кампаніі	Процант выкананьня
Белкаапплодагароднінна	125	69,8	55,8
Белплодагароднінна	66	28,2	42,8
РАЗАМ	191	98,0	51,4

Паводле даных на 28 кастрычніка БССР адгрузіла Ленінграду 51,4 проц. заданьня. Такія тэмпы адгрузкі бульбы ні ў якім разе нельга лічыць здавальняючымі, прымаючы пад увагу, што апошні тэрмін адпраўкі—1 лістапада.

Прыклад Лагойскага, Заслаўскага, Лельчыцкага і Мсьціслаўскага раёнаў, якія ўжо скончылі адгрузку, паказвае усю рэальнасьць пляну, гаворыць аб тым, што ўся справа ў мабілізацыі сіл, у своечасовым скончаньні ўборкі, у барацьбе са стратамі шляхам перавораньня бульбянікоў і ў непасрэднай падачы бульбы ў вагоны проста з поля.

Ёсьць раёны, як напрыклад, Тураўскі, Лоеўскі і Пятрыкоўскі, якія да 27 кастрычніка не адгрузілі ні аднэй тоны. Гэтыя раёны ганебна парушаюць свае абавязацельствы перад пралетарамі гораду Леніна.

Задача скончэньня адгрузкі да 1 лістапада патрабуе неадкладнага фарсаваньня тэмпаў загатовак і адпраўкі бульбы, поўнай ліквідацыі перабояў у падачы пераважняка.

БССР павінна ў бліжэйшыя дні разгортваць партыі і ўраду аб поўным выкананьні пляну.

Ход адгрузкі бульбы па БССР

(на 27 кастрычніка, у проц. да заданьня)

№№ па ч.	Назва раёну	Проц. выкан.
1.	Лагойскі	103,0
2.	Заслаўскі	102,0
3.	Лельчыцкі	101,1
4.	Мсьціслаўскі	100,0
5.	Аршанскі	81,0
6.	Расонскі	80,6
7.	Лёзьненскі	77,6
8.	Касьцюковіцкі	74,8
9.	Скуцкі	73,2
10.	Веткаўскі	71,8
11.	Камарынскі	71,6
12.	Крычаўскі	68,1
13.	Койданаўскі	63,3
14.	Дрысенскі	61,0
15.	Пухавіцкі	60,8
16.	Чачэрскі	56,8
17.	Бярэзінскі	56,2
18.	Вягомльскі	54,6
19.	Магілеўскі	54,3
20.	Шклоўскі	53,9
21.	Жлобінскі	53,6
22.	Сеньненскі	53,4
23.	Чэрыкаўскі	52,9
24.	Полацкі	52,9
25.	Плешчаніцкі	52,4
26.	Талачынскі	51,6
27.	Жыткавіцкі	51,6
28.	Лепельскі	50,9
29.	Церахаўскі	48,7
30.	Мазырскі	47,9
31.	Клімавіцкі	47,8
32.	Рэчыцкі	47,7
33.	Гарадоцкі	47,2
34.	Буда-Кашалёўскі	47,0
35.	Любаньскі	46,6
36.	Стара-Дарожскі	46,1
37.	Уваравіцкі	46,1
38.	Хойніцкі	45,7
39.	Вушацкі	45,2
40.	Рагачоўскі	45,2
41.	Віцебскі	45,0
42.	Парыцкі	44,3
43.	Клічаўскі	44,1
44.	Крупскі	43,9
45.	Чашніцкі	43,2
46.	Быхаўскі	42,8
47.	Сіроцінскі	42,6
48.	Асьвейскі	42,6
49.	Ельскі	40,6
50.	Барысаўскі	39,6
51.	Чаўскі	39,5
52.	Дубровенскі	38,7
53.	Асіпавіцкі	38,5
54.	Смалявіцкі	37,9
55.	Бялынічскі	36,0
56.	Капыльскі	29,4
57.	Бабруйскі	28,8
58.	Чэрвеньскі	27,3
59.	Глускі	25,9
60.	Старобінскі	22,4
61.	Сураскі	19,4
62.	Кармянскі	18,3
63.	Пранойскі	18,2
64.	Чырвонаармейскі	17,9
65.	Беспалковіцкі	16,9
66.	Браглінскі	16,4
67.	Нараўлянскі	11,2
68.	Тураўскі	0,0
69.	Лоеўскі	0,0
70.	Пятрыкоўскі	0,0
	РАЗАМ	49,9

ПЕРАДАВІКІ АДГРУЗКІ

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ПА-БАЯВОМУ ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ГОРАДАМ ЛЕНІНА, ПА-УДАРНАМУ АДГРУЖАЮЦЬ БУЛЬБУ:

1. **ЛАГОЙСКІ РАЁН** ДА 27 КАСТРЫЧНІКА ВЫКАНАЎ 103 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

2. **ЗАСЛАЎСКІ РАЁН** ДА 27 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЗІЎ ЛЕНІНГРАДУ 102 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

3. **ЛЕЛЬЧЫЦКІ** РАЁН ВЫКАНАЎ СВАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА АДГРУЗЦЫ НА 101,1 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

4. **МСЬЦІСЛАЎСКІ** РАЁН АДПРАВІЎ ЛЕНІНГРАДУ 100 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Зрываюць адгрузку

Наступныя раёны вельмі дрэнна адгружаюць бульбу, не мабілізавалі ўсіх сіл, каб у тэрмін выканаць свае абавязацельства перад рабочымі Ленінграду.

НАРАЎЛЯНСКІ раён адгрузіў 11,2 проц. пляну, БРАГІНСКІ—16,4 проц., БЕШАНКОВІЦКІ—16,9 проц. пляну, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ—17,9 проц., ПРАНОЙСКІ—18,2 проц., КАРМЯНСКІ—18,3 проц. заданьня.

Нічога не адгрузілі

ПЯТРЫКОЎСКІ, ЛОЕЎСКІ І ТУРАЎСКІ РАЁНЫ ДА 27 КАСТРЫЧНІКА НЕ АДГРУЗІЛІ НІ АДНЭЙ ТОНЫ БУЛЬБЫ.

Прэміі—перадавіком

Шасьцёрка па загатоўцы і адгрузцы бульбы пры ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанавіла вылучаны, паводле пастановы партыі і ўраду, прэміяльны фонд у разьмеры 120 тыс. р. скнасьці за рахунек узносаў бульбапакупаючых арганізацый. Прэміі будуць выдавацца раёнам, сельсаветам, калгасам, пасобным рэспубліканскім арганізацыям, работнікам сельскага, партыйнага і загатоўчага апарату ўсіх зьвёнаў, а таксама работнікам друку і тэрміновіцту за бялую ўдарную работу, якая забясьпечыла поўнасьцю і яснае выкананьне пляну загатовак і адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Для прэміяваньня пасобных раёнаў вызначана 17 прэмій—1 першая прэмія на суму 10 тыс. руб., 6 другіх прэмій на суму 30 тыс. руб., 10 трэціх прэмій на 30 тыс. р.

ПЕРШУЮ ПРЭМІЮ атрымліваюць раёны, якія першымі скончылі план адгрузкі ў межах ад 5 да 8 тысяч тон.

ДРУГІЯ ПРЭМІІ атрымліваюць раёны, першымі скончыўшыя план вывазу ў межах ад 3 да 5 тыс. тон.

ТРЭЦІЯ ПРЭМІІ будуць выданы раёнам, якія першымі скончылі план адгрузкі ў межах ад 1 да 3 тыс. тон.

Для прэміяваньня пасобных сельсаветаў вызначаецца 35 прэмій—5 першых на 1.500 руб., 10 другіх на 2.000 руб. і 20 трэціх на суму 3.000 руб. Адначасова з гэтым вызначаюцца персанальныя прэміі для пасобных працаўшых свае работнікаў у суме ад 200 да 500 руб.; гэтыя прэміі разьмяркоўваюцца непасрэдна шасьцёркамі.

У першых радох

ЛЕПЕЛЬ. ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁНУ, НА АСНОВЕ ЎМЕЛАГА СПАЛУЧЭНЬНЯ ЎСІХ АСЕНЬНІХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ ЗАДАНЬНІ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ. КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» ЗДАЎ 16 ТОН, «ЧЫРВОНЫ БАТРАК»—16. ВЫКАНАЛІ СВАЕ ЗАДАНЬНІ ТАКСАМА КАЛГАСЫ «НОВЫ БУДАЎНІК» І «ЧЫРВОНАЕ ЗАБАЛОЦЬЦЕ».

ПРЫКЛАДУ ПЕРАДАВІКОЎ ПАВІННЫ НАСЬЛЕДВАЦЬ УСЕ КАЛГАСЫ РАЁНУ.

П-р.

Загатоўкі адкладваюць

ЛЮБАНЬ. Ня гледзячы на наступленьне замаразкаў, выкананьне пляну адгрузкі бульбы па Любаньскім раёне ідзе нездавальняча. Аднаасобны сэктар па 25 кастрычніка здаў толькі каля 30 проц. заданьня. Цьвёрдазаданьнікі выканалі 40 проц. пляну.

Лепш стаіць справа на калгасным сэктары, які здаў каля 70 проц. пляну.

На саманёж пакінуты загатоўкі бульбы сярод аднаасобнікаў. У той час, як аднаасобныя гаспадаркі даўно ўжо скончылі ўборку, здача бульбы ідзе вельмі і вельмі павольна.

У раёне назіраюцца выпадкі, калі розныя спэкулянты езьдзяць па вёсках і купляюць бульбу ў аднаасобнікаў (Рэцкаўскі, Тальскі сельсаветы), прапануючы ім тавары і грошы, вышэй коммэрцыйных цэн.

Т. В.

За нераспарадчасьць і нядбайныя адносіны—пад суд!

Упаўнаважаны камітэту па загатоўках сельгаспрадуктаў пры СНА па БССР тав. **Бэнэк** выдаў наступны загад:

«Нам, упаўнаважанага Белканторы ЛСПО т. **Калешка** навінен быў 21 кастрычніка адправіць з Менску ў Бялынічскі раён чатыры аўтацягачы для адгрузкі загатоўленай на ст. Магілеў у колькасьці 800 тон бульбы для далейшай адпраўкі ў Ленінград.

Пры паездцы т. Бэнэка 24 кастрычніка ў Бялынічскі раён было ўстаноўлена, што чатыры аўтацягачы з-за недахвату гаручага, прайшоўшы палову дарогі (м. Бярэзіна), павінны былі спыніцца і замест 22 кастрычніка прыбылі ў Бялынічы толькі 25-га. Спазьненьне на тры дні паставіла пад пагрозу своечасовую адгрузку бульбы Ленінграду.

Усё гэта здарылася з-за нераспарадчасьці і нядбайных адносін да работы з боку т. **Калешка**. У сувязі з гэтым тав. Калешка зьмяняецца з работы, справа перадаецца сьледчым органам для прыцягненьня да судовай адказнасьці».

За 2 дні не адгружаны 82 вагоны

Апошнія зводкі аб нагрузцы бульбы гавораць аб неадпаведнай рабоце як чыгункі, так і загатоўчых арганізацый.

Чыгунка ня выконвае дырэктыў аб хуткай і бесьперашкодлай падачы пагрузчыка. Паводле даных на 23 кастрычніка, на гэтае чыгунка не падала 12 вагонаў, зводка на 24 кастрычніка гаворыць аб непадачы 2-х вагонаў.

Ёсьць шмат выпадкаў недагрузу па віне загатоўчых арганізацый. На станцыях Ельск, Мазыр, Слуцак, Сіроціна, Старушка, Фанёль, Негарэлае, Мар'іны на віне клієнтуры не адгружана 36 кастрычніка 36 вагонаў, а 24-га — 32 вагоны. Прычына — непадвоз грузаў.

Задача поўнага выкананьня лёзунгу адгрузкі бульбы да 1 лістапада патрабуе неадкладнай ліквідацыі прастояў вагонаў і затрымаўшу з адгрузкай.

ЗА МЯЖОЙ

Бюджэт вайны

ВАРШАВА, 28. (Уласная інфармацыя). У фашысцкай прасе апублікован зацьверджаны радай міністраў праект польскага бюджэту на 1933-34 год. Даходная частка бюджэту складае 2.088 млн. злотых, а выдаткі—2.449 млн. Дэфіцыт складае 361 млн. злотых.

Бюджэт новага году—гэта бюджэт яшчэ большага рабаўніцтва працоўных мас Польшчы. З гэтай мэтай ужо цяпер па ўсёй краіне стараюцца спэцыяльныя «экзэкуцыйныя батальёны» для спагнаньня падаткаў.

Дзяржаўныя даходы ў 1929-1930 годзе складалі 3.031 млн. злотых, а ў 1931-32 г. ўсяго 2242 млн. злотых.

За першыя 5 месяцаў 1929-30 г. даходы складалі 1.213,7 млн. злотых, а ў 1932 г. —толькі 782,7 млн. злотых.

Простыя падаткі ў 1929-30 г. далі дзяржаве 310 млн. злотых, а ў 1932 г. — 206 млн. злотых.

Укосныя падаткі за аднаведныя гады далі 77 і 64 млн. злотых. Такім чынам даходы ва ўсіх галінах гаспадаркі бязупынна ПАДАЮЦЬ.

Толькі адна галіна бюджэту дае даход, які з кожным годам расьце—гэта так званыя «адміністрацыйныя даходы». Яны складаюцца з тых штрафаў, якія спагняюцца паліцыяй за несвачасовы ўзнос падаткаў, за парушэньне розных распараджэньняў фашысцкіх улад і г. д.

Адміністрацыйныя даходы ў 1929-30 г. складалі 100,8 млн. злотых, а ў 1932-33 г.—173,8 млн. злотых. Невыплаканая ў аднэй толькі Варшаве зараз знаходзіцца ў судзе 400.000 спраў аб няўзносах падаткаў.

Праса не паведамляе як разьмяркоўваюцца выдаткі ў новым бюджэце паміж асобнымі міністэрствамі. Сьмела аднак, можна сказаць, што ў будучым годзе, як і мінулым будуць павялічаны выдаткі на ўзбраеньні і на ўтрыманьне апарату тэрору. Фашысцкі «Кур'ер віленскі» ад 23 кастрычніка так характарызуе новы бюджэт:

«Новы бюджэт у адным будзе падобны да старога, а іменна ў ім зусім не прадугледжаны сродкі на інвэстыцыі (на будаўніцтва) і такім чынам ён (бюджэт) не ажывіць гаспадарчага жыцьця краіны».

Вельмі яркі малюнак, на што ідуць у фашысцкай Польшчы народныя сродкі, паказвае разьмеркаваньне бюджэтных выдаткаў мінулага году:

ВАЕННАЕ міністэрства—832.650.000; міністэрства ўнутраных спраў—211.595.527. З гэтай сумы на ўтрыманьне паліцыі выдаткавана—113.018.627 злотых і на ўтрыманьне корпусу аховы граніц з СССР — 44.487.500.

Міністэрства фінансаў—114.909.350 злотых. З гэтай сумы выдаткавана на ўтрыманьне падатковых экзэкутараў—10 млн. злотых і ўзнагароду экзэкутараў за старанное сьцягваньне падаткаў—1.800.000 злотых.

Міністэрства рэлігіі і народнай асьветы —348.033.300 злотых. З гэтых сум на ўтрыманьне ксяндзоў і ваенную падрыхтоўку моладзі выдаткавана звыш 30 млн. злотых, у той час, як, скажам, на сярэднія школы было адпушчана ўсяго 27.880.700.

Міністэрства грамадзкіх работ—38.306.000 злотых. З гэтай сумы на пабудову ваеннага порту ў Гдыні адпушчана 10.261.445. Міністэрства зямельных рэформ—11.760 тыс. злотых, прычым з іх на ваеннае асадніцтва—3.295.200.

Гэтае разьмеркаваньне бюджэтных выдаткаў, эразумела, далёка ня поўнае. Але і яно даволі выразна паказвае, куды ідуць народныя сродкі ў фашысцкай Польшчы. Адно толькі ваеннае міністэрства на афіцыяльных даных пажырае 832.650 тыс. злотых. Сюды трэба дадаць 113.018.627 злотых на ўтрыманьне паліцыі, 44.487.500 злотых на ўтрыманьне корпусу аховы граніц з СССР і 7.900.000 злотых на ваенную падрыхтоўку моладзі. Агульныя асыгнаваньні на падрыхтоўку вайны, такім чынам, вырастаюць да 1.019.121.377 злотых, што складае амаль палову афіцыяльных дзяржаўных выдаткаў.

На падрыхтоўку вайны фашысцкая дыктатура кідае вялізарнейшыя сродкі, у той час, як у Польшчы масы беспрацоўных пазіраюць з голаду, як бязупынна зьмяншаецца і без таго галодная зарплата рабочых!..

С.

„ФРАНЦЫІ—УСЁ, ГЕРМАНІІ—НІЧОГА"

РЭЗКАЯ КРЫТЫКА ФРАНЦУСКІХ ПРАПАНОЎ

БЭРЛІН, 27 (ТАСС). Афіцыёз германскага міністэрства замежных спраў «Дойчэ дыплёматышэ карэспандэнц» рэзка крытыкуе новы французкі праект «раззбраеньня».

«Увесь праект, — піша газэта, — выпрацаваны Францыяй, ня толькі зьяўляецца складаным, але і яго ажыцьцяўленьне наўрад ці магчыма прадбачыць. Пры гэтым зноў ставіцца патрабаваньні аб гарантыях, якіх, аднак, на практыцы нельга ажыцьцявіць. Існуюць меркаваньні, што Францыя гэтымі праектамі толькі прасьледуе мэту стварыць перашкоды для сапраўднага раззбраеньня. Разам з тым, Францыя відавочна не задавальняецца нават такімі гарантыйнымі дагаворамі. Увесь плян зводзіцца толькі да таго, каб забясьпечыць Францыі ўсё, а Германіі ня даць нічога».

БЭРЛІН, 28 (ТАСС). Перагаворы аб супрацоўніцтве паміж прускім урадам Браўна-Зэвэрынга і агульна-германскім урадам пачаліся ўчора сустрэчай прадстаўніка ўраду Браўна-Зэвэрынга ў вярхоўным судзе з статс-сакратаром Мэйнэрам.

Учора былі таксама апублікаваны ў некаторых газэтах паведамленьні аб тым, нібы Гінденбург у выніку пастаноў вярхоўнага суда больш не аказвае давер'я рэйхс-канцлеру Папэну. Гэтыя паведамленьні афіцыяльна абвяргаюцца, прычым падкрэсьліваюцца, што Папэн па-ранейшаму «карыстаецца поўным давер'ем прэзыдэнта».

МАНІФЭСТ КП ФРАНЦЫІ І ГЕРМАНІІ

БЭРЛІН, 27. Учора ў двух прамысловых гарадох Рурскай вобласьці — Эсэне і Дартмундзе — адбыліся шматлюдныя рабочыя сходы. На сходзе у Эсэне прымала ўдзел 25 тыс. рабочых, у Дартмундзе — 40 тыс. На абодвых сходах ад імя Цэнтральнага Камітэту кампартыі Германіі выступіў Тэльман, спатканы бурнай авацыяй. І ў Эсэне, і ў Дартмундзе ўхвален тэкст агульнага маніфэсту кампартыі Германіі і Францыі да працоўных Германіі і Францыі.

Маніфэст заклікае ўсіх працоўных Германіі і Францыі да барацьбы супроць уласных імпэрыялістаў, супроць падбухторшчыкаў да імпэрыялістычнай вайны, супроць фашызму, шавіністычнага цкаваньня і нацыфіцыцкага ашукацтва і да барацьбы ў абарону СССР.

Адозва падпісана ЦК кампартыі Германіі, ЦК камсамолу Германіі, ЦК кампартыі Францыі, ЦК камсамолу Францыі і абласным камітэтам кампартыі Эльзас-Лётарынгіі.

ЗАКОНАПРАЕКТ ГЕРМАНСКАЙ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН. (ТАСС). Германская кампартыя ўносіць у новы рэйхстаг законапраект наступнага зьместу: «Рэйхстаг пастанаўляе: «па-першае, вэрсальскі дагавор анулюецца і абвяшчаецца несапраўдным. На-другое, павінны быць ануляваны ўсе выдаткі на ваенным бюджэце, морскім бюджэце, усе выдаткі па паверстанай абароне, па супроць газавай абароне, на нацыянальным ваяніза-ваным спорце, на ўтрыманьні палітычнай паліцыі, камунальнай паліцыі і жандармэрыі ў агульнадзяржаўным бюджэце Германіі і ў бюджэтах пасобных дзяржаў і му-

Лёзунгі да XV гадавіны Кастрычніка

1. Няхай жыве 15-я гадавіна Кастрычніка! Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ва ўсім сьвеце!
2. Рабочыя і работніцы, працоўныя ўсіх краін! Прыгнечаныя народы капініі! У дзень 15-й гадавіны Кастрычніка вышэй сьцяг Леніна, сьцяг пераможнай пралетарскай рэвалюцыі! Уперад да сусьветнага Кастрычніка!
3. У краінах капіталу расьце хваля стачак, расьце новы ўздым рэвалюцыйнага руху. Пралетары ўсяго сьвету! Моцней удар па загніваючаму капіталізму! За рэвалюцыйны выхад з крызісу! За дыктатуру пралетарыяту!
4. Крызіс у капіталістычных краінах асуджае дзесяткі мільёнаў рабочых і сялян на голад, галечу і выраджэньне. У краіне Саветаў з посьпехам заканчваецца першая пяцігодка, ліквідавана беспрацоўе, узрастае матар'яльны і культурны ўзровень працоўных. Далоў капіталізм! Няхай жыве сацыялізм!
5. Пралетары ўсіх краін! Сацыял-фашысты — галоўная апора капіталізму. Ганьба прэч правадыроў сацыял-дэмакратыі і іх «левую» агітатуру! Станавіцеся пад баявы сьцяг Ленінскага Камуністычнага Інтэрнацыяналу!
6. Імпарыялісты рыхтуюць новыя войны, рыхтуюць напад на СССР. Пралетары ўсіх краін! Рыхтуйцеся да абароны краіны Саветаў — бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету!
7. Імпарыялісты пад прыкрыцьцём разбэрэшных канфэрэнцый рыхтуюць новую грабежніцкую вайну. Толькі Савецкі саюз вядзе сапраўдную барацьбу за мір. Пралетарыі і працоўныя ўсіх краін! Арганізуйце адзіны фронт супрэць імпарыялістычнай вайны! Няхай жыве савецкая палітыка міру!
8. Імпарыялісты Азіі, Эўропы і Амэрыкі праводзяць палітыку падзелу Кітаю і задушэньня кітайскай рэвалюцыі. Пралетары ўсяго сьвету! Абараняйце кітайскую рэвалюцыю! Няхай жыве Чырвоная армія Кітаю!
9. Братэм па клясе, вязьням капіталу, ахвярам фашысцкага тэрору — гарачае пралетарскае прывітаньне!
10. Няхай жыве Чырвоная армія Савецкага саюзу — апор мірнай палітыкі савецкай улады, пільны пастаны савецкіх межаў, верны вартавы Кастрычніцкай рэвалюцыі.
11. Байцы і камандзіры Чырвонай арміі! Пераўтварэйце ў жыцьцё лёзунг т. Сталіна: «большавікі авалодаюць тэхнікай». Тэхніка ва ўмелых руках Чырвонай арміі ўмацоўвае яе магутнасьць і гарантуе недатыкальнасьць савецкіх межаў.
12. Мы адной пядзі чужой зямлі не хочам. Але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо ніному» (Сталін).

Пятнаццатую гадавіну Кастрычніка сустрэнем новымі перамогамі сацыялістычнага будаўніцтва! Большавікам напорам і арганізаванасьцю пераможам труднасьці! За новы ўздым сацпабудаўніцтва і ўдарніцтва. Пераможна закончым першую пяцігодку за чатыры гады.

14. Прывітаньне ўдарнікам і ўдарніцам — слаўным героям савецкага будаўніцтва!
15. Узмацні правуючасьць працы на заводах і фабрыках, у капальнях і на транспарце, у саўгасах і калгасах — важнейшая задача арганізатараў сацыялістычнай гаспадаркі, справа ўсёй рабочай клясы.
16. Канкрэтным большавіцкім кіраўніцтвам, рашучым паляпшэньнем якасьці нашай работы, аўладаньнем тэхнікай, падрыхтоўкай кадраў, арганізацыяй правэркі выкананьня — забясьпечым тэмпы сацыялістычнага наступленьня.
17. Аб'ядноўваем творчую ініцыятыву працоўных мас, навуку і тэхніку для стварэньня другога пяцігадовага плану — плану пабудовы бліскучага сацыялістычнага грамадзтва!
18. Метапорыя — аснова народнай гаспадаркі. Гарнавы, сталяры, прамотчыкі, рабочыя металургіі! Большавіцкімі тэмпамі дабіцеся перамогі ў вялікай барацьбе за металь!
19. Рабочыя-вугальшчыкі! Краіна чакае ад вас рэкорда перамогу ў здабычы вугалю. Ператорым вугальныя раёны з адсталых у перадавыя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва!
20. Гонар савецкай краіны — Дняпроўская гідраэлектрастанцыя пушчана. Накіруем усе намаганьні на своечасовае сканчэньне будаўніцтва Дняпроўскага прамысловага камбінату. Наперад, да новых перамог на фронце ленінскай электрыфікацыі!
21. Рабочыя-чыгуначнікі! Даб'емся поўнага задаўленьня паравознага і вагоннага парку! Вышэй тэмпы пагрузкі! Забясьпечым прамысловыя цэнтры вугалем, матэрыялам, хлебам і гародніной! Выканаем з гонарам план асеньня-зімовых перавозак!
22. Усе варштаты лёгкай індустрыі на поўны ход! Выканаем поўнасьцю план тавараў шырокага ўжытку! За высакаякасную прадукцыю! За эканомію сырцу! Сустрэчным патокам тавараў разгорнем савецкі гандаль! Яшчэ больш умацуем сувязь гораду і вёскі!
23. Саматужнікі Савецкага саюзу! Шырэй разгортвайце выраб тавараў шырокага ўжытку!
24. Ганьба дэзарганізатарам сацыялістычнага будаўніцтва — шкоднікам, ворагам і пратульшчыкам! Няхай жыве пралетарская дысцыпліна ў прамысловасьці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы!
25. Сельская гаспадарка СССР канчаткова замацавалася на сацыялістычным шляху. Рабочыя і калгасьнікі! Давершым справу ліквідацыі кулацтва як класы, даб'ем рэшткі кулацтва! Няхай жыве саюз рабочых і сялян, будуючых і ўмацоўваючых калгасы!
26. Правільнай арганізацыяй працы на аснове зьдзельшчыны, умацаваньнем пастаянных вытворчых брыгад, разьвіваньнем па працаднях грашовых і натуральных даходаў — даб'емся яшчэ большага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.
27. За ўсямернае павышэньне ўраджайнасьці! За культурную апрацоўку сацыялістычных палёў! За аўладаньне аграрнай навукай і тэхнікай! Больш інициятывы, больш самадзейнасьці ў барацьбе за якасьць сацыялістычнага зямляробства!
28. Узорнай арганізацыяй калгаснай гаспадаркі, калектыўнай працай павысім даходнасьць калгасных палёў і забясьпечым рост матар'яльнага дабрабыту калгасьніка.
29. Ператорым МТС у сапраўдных арганізатараў калгаснай вытворчасьці, у цэнтр барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці сацыялістычных палёў!
30. Грамадзкая ўласнасьць сьвяшчэнна і недатыкальна! Да суровай адказнасьці кулака і яго агентаў за малейшыя спробы шкодзіць грамадзкай справе! Рабочыя! Калгасьнікі! Пільна ахоўвайце грамадзкую ўласнасьць калгасаў, саўгасаў, капэрацыйных і дзяржаўных прадпрыемстваў!
31. Барацьба за хлеб — барацьба за сацыялізм. Моцней ударым па кулаку, спэкулянту, перакупшчыку — дэзарганізатарах збожжазагатовак! Плян збожжазагатовак выканаем у тэрмін!
32. Савецкай кастрацыі — большавіцкія кадры. Работнікі прыпаўку! Станавіцеся ў рады ўдарнікаў сацыялістычнае працы! Пастаўім на вучасткі савецкага гандлю лепшых работнікаў!
33. Павядзем рашучую барацьбу са спэкулянтамі, уздуваньнем цэн! Выпрэцім нэпманскі дух з гандлёвага апарату! Створым узорныя калгасныя базары!
34. Разгортваньнем загатовак, стварэньнем уласных харчовых баз, арганізацыяй прыгарадных гаспадарак пры заводах, капальнях і фабрыках — даб'емся далейшага паляпшэньня рабочага снабжэньня!
35. Штодзённыя клопаты аб матар'яльных патрэбах рабочых і сялян — важнейшая ўмова будаўніцтва сацыялізму. За далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў працоўных, за ўзорнае грамадзкае харчаваньне!
36. Гэрэічнай моладзі краіны Саветаў, якая будуе і ўмацоўвае пад кіраўніцтвам ленінскай партыі сусьветны камунізм, — гарачае прывітаньне! Няхай жыве камсамольская плеяда!
37. Камсамольцы! Будзьце ў першых радах змагароў за сацыялізм, за індустрыялізацыю краіны, за аўладаньне тэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за разьвіцьцё вырабу тавараў шырокага ўжытку і савецкага гандлю, за аўладаньне марксыцка-ленінскай тэорыяй!
38. Юныя піянэры — дзеці Кастрычніка! Будзьце гатовы працаваць і зоймаўцеся ўмілую справу Леніна — справу Соусьветнага Кастрычніка!
39. Кастрычніцкая рэвалюцыя разьняволіла работніцу і селяніку. Узьнімем на яшчэ большую вышыню ролю працоўнай жанчыны ў грамадзкім і вытворчым жыцьці краіны!
40. Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка! Няхай жыве непарушнае адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР!
41. Назустрэч усе дасягненьні культуры — на службу разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню!
42. Дзяржава пралетарскай дыктатуры за 15 год забясьпечыла вялізарнейшыя дасягненьні ў галіне культуры. Удзвоецярыя намаганьні для яшчэ большага росквіту сацыялістычнай культуры!
43. Рашуча палепшым якасьць вучобы! — Савецкай школе — большавіцкую дысцыпліну! Павысім ролю настаўніка! Забясьпечым у школе падрыхтоўку актыўных будаўнікоў сацыялізму!
44. «Са сьцягам Леніна перамаглі мы ў баёх за Кастрычніцкую рэвалюцыю, са сьцягам Леніна дабіцеся мы рашаючых посьпехаў у барацьбе за перамогу сацыялістычнага будаўніцтва, з гэтым-жа сьцягам пераможам у пралетарскай рэвалюцыі за ўсім сьвеце. Няхай жыве ленінізм» (Сталін).
45. Няхай жыве УсеКП(б) — правадыр і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!
46. Рабочыя і калгасьнікі, усе працоўныя! Шчыльней рады вакол УсеКП(б)! За генэральную лінію партыі! За большавіцкія тэмпы! За перамогу сацыялізму!
47. Лепшых ударнікаў, перадавых пралетараў і выдатных калгасьнікаў — у рады ленінскай партыі!
48. Уверсім кожнага камуніста марксыцка-ленінскім выхаваньнем! За высокі тэарэтычны ўзровень, за ідэйную стойкасьць членаў большавіцкай партыі!
49. Рэшткі капіталістычных клясаў аказваюць шалёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню. Рабочыя і калгасьнікі! Пазбавім клясавую пільнасьць! Згуртуемся вакол большавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК! Умацуем пралетарскую дыктатуру! Даб'ем рэшткі капіталістычных клясаў!
50. Далоў дэзарганізатараў сацыялістычнага будаўніцтва — правых і «левых» апартуністаў! Няхай жыве ленінскае адзінства большавіцкіх радоў!
51. Пераможам перажыткі капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, атрымаем рашучую перамогу над кожнасьцю, руцінай, бюракратызмам, дробна-ўласьніцкімі звычкамі! Ператорым усё працоўнае насельніцтва нашай краіны ў актыўных будаўнікоў сацыялізму.
52. Камуністы і камсамольцы! На перадавыя лініі барацьбы за выкананьне грамфінплану сацвяртага — апошняга году першай пяцігодкі! За забясьпячэньне подступу да другой пяцігодкі!
53. Пад сьцягам барацьбы за ўладу Саветаў перамагла Кастрычніцкая рэвалюцыя. Няхай жывуць Саветы — органы дыктатуры рабочае клясы, правадзімі ленінскай палітыкі большавіцкай партыі!
54. Пад сьцягам большавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК — наперад, да новых перамог! Вышэй сьцяг УсеКП(б) — арганізатара Кастрычніцкай рэвалюцыі!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ).

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі

У дэкаду ўраджаю і калектывізацыі ліквідаваць прарыў па зяблеву

Ход зяблева і сяўбы азімых па БССР

(у га і процантах)

	ЗАЗЯБЛЕНА		ЗАСЕЯНА	
На 25-X-32 г.	554.337	37,0 проц.	1.223.167	89,9 проц.
„ 20-X-32 г.	463.519	30,9 „	1.221.787	89,8 „
„ 25-X-31 г.	498.296	29,8 „	1.261.548	93,4 „

Пятая пяцідзёўка кастрычніка месяца дала прырост па зяблеве на **90 тыс.** га замест **69 тыс.** га чацьвертай пяцідзёўкі. Прырост зусім мізэрны. Зразумела, што такія тэмпы не забясьпечаць 100 проц. выкананьня пляну нават і да Кастрычніцкіх сьвят.

Па паўночнай зоне плян выканан на **23,4** проц., цэнтральнай—**40,9** проц., паўднёвай—**42,6** проц. Лічбы паказваюць, што асабліва **адстаюць ільняныя раёны** паўночнай зоны. Між тым дырэктыва партыі і ўраду абавязвае правесьці зяблева ў першую чаргу пад тэхнічныя і кармовыя культуры.

Узор барацьбы за раньняе зяблева паказалі **Тураўскі** (118,6 проц. выкананьня пляну) і **Жыткавіцкі** (100 проц.) раёны. Посьпехі дасягнуты дзякуючы канкрэтнаму апэрацыйнаму кіраўніцтву з боку раённых камітэтаў партыі. Па іх павінны раўняцца ўсе астатнія раёны БССР.

Ганебна адстаюць 15 раёнаў БССР, якія на 25 кастрычніка нават не дасягнулі і 20 проц. выкананьня пляну. **Самыя адсталыя** з іх: **Расонскі**—6,6 проц., **Бягомльскі**—8,5 проц., **Лепельскі**—9,0 проц., **Асьвейскі**—9,5 проц., **Чашніцкі**—11,5 проц., **Сеньненскі**—12,5 проц.

Прычына адставаньня крыецца ў тым, што не арганізаваны ў калгасах пастаянныя вытворчыя брыгады, не ліквідавана абязьлічка зямлі, ня выканана дырэктыва аб пераходзе на зяблева ўсяго трактарнага парку і 70 проц. конскай цягавай сілы.

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі павінна быць скарыстана для поўнага выкананьня пляну кожным раёнам. Треба памятаць, што **барацьба за зяблева, гэта ёсьць барацьба за высокі ўраджай у першым годзе другой пяцігодкі.**

СЛУЦКІЯ „ДРОБЯЗІ“

СЛУЦАК. (Наш кар.). З чым сустракаюць дэкаду ўраджаю і калектывізацыі калгасы Случчыны? Ці ёсьць тут сапраўдная барацьба за ўкараненьне агратэхнікі? Адказ трэба даць адмоўны.

Гэта-ж факт, што калгас «**Случ**», які лічыцца **перадавым** у раёне, на працягу 3-х год сее азімае жыта па іржышчы. Аб гэтым ведаюць аграномы, ведае райзэ, ведае і сакратар **райкому тав. Соскін.** Але яны ніякіх захадаў ня прымаюць, аб увядзеньні севазвароту ня думаюць.

Аграномы райзэ і МТС павінны ўзначаліць барацьбу за ўкараненьне агратэхнікі, за высокі ўраджай. Між тым сам тав. **Магілеўскі** (агранам райзэ) расказвае, што яму ў месяц толькі адзін раз удаецца выравацца з канцылярыі і паехаць у калгас. У **Стараўскім** сельсавеце калгасьнікі нават забыліся, што на сьвеце існуе агратэхнічны пэрсанал.

Пры такіх умовах работы, пры такіх «тэмпах» ніколі не пераканаеш вопыту агранамічнай навукі на саўгасным і калгасным палі.

Як-жа на Случчыне праходзіць зяблева? Ці выконваецца важнейшая дырэктыва партыі і ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці на лініі лепшай апрацоўкі зямлі?

Калі верыць лічбам райзэ, на 20 кастрычніка плян зяблева быў выканан на 40,4 проц., а на 25—52,8 проц. Але верыць гэтым лічбам цяжка. Напрыклад, па **В.-Слуцкім** сельсавеце (так паказана ў зводцы райзэ) на 20 кастрычніка было зазяблена **56,4** проц., а на **25—54,7** проц. Зьніжэньне на **1,7** проц. Як відаць, лічбы бяруцца са столі, ніхто іх не правярае, ніхто па-дзелавому ня цікавіцца, як праходзіць зяблева.

Ні райзэ, ні МТС, ні райком па-большавіцку не мабілізуюць масы на зяблева, як адно з важнейшых мерапрыемстваў у павышэньні ўраджайнасьці яравых 1933 г.

Маруднасьць тэмпаў тлумачыцца перш за ўсё тым, што не выкарыстоўваецца конская цягавая сіла, не ўмацоўваецца пастаянная вытворчая калгасная брыгада.

У калгасе «**Чырвоная перамога**» 21 кастрычніка 43 рабочых кані спакойна хадзілі на полі і аб іх выкарыстаньні нават ніхто і ня думаў. У гэтым-жа калгасе спраўны трактар «Інтэр» па віне загадчыка 4-га вытворчага вучастку **Вяземцава** прастаяў некалькі дзён без працы.

Вытворчыя брыгады ня ўсюды арганізаваны, а там, дзе і былі арганізаваны, пачынаюць распадацца. Характэрнай ілюстрацыяй можа служыць той-жа калгас «Чырвоная перамога». Тут існуе поўная абязьлічка коняй, с.-г. інвэнтару, зямельных вучасткаў. У выніку абязьлічкі на 4 кані засталося толькі 15-20 камплектаў збруі.

Такімі «дробязямі», як адсутнасьць збруі, калёс, плугоў і г. д., ня цікавяцца мясцовыя работнікі. А гэтыя «дробязі» ў значнай ступені тармозяць пасьпяховае сканчэньне пляну зяблева.

За выкананьне пляну зяблева, за павышэньне ўраджайнасьці **нясе адказнасьць** у першую чаргу Случкі раённы камітэт партыі.

Б. Х.

Жывая работа падменена цыркулярамі

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Загадчык Рэчыцкага райзэ **Таміляў** парушыў праяўіць сваю ініцыятыву. Узяў лёст шанеры, алешак і праз некалькі хвілін гатоў новы цыркуляр. Зьмест яго зусім кароткі.

«14 кастрычніка ў рабоце правядзіцца дзень ураджаю і калектывізацыі. Прапануецца 13 кастрычніка правесьці ўрачыстыя нарадженьні сельсаветаў, а 14-га агульны сход калгаснікаў. Адначасова забясьпечыць дасылку экспэдыцыі на с.-г. выстаўку: жывых 14/X, а астатнія — 13/X».

Вось і ўсё. 12 кастрычніка цыркуляр напісаў, а 14-га павінна быць выстаўка. Зразумела, што тэмпы падвялі. Да сельсаветаў цыркуляр не дашоў. Выстаўка сарвалася, сарвалася і раённая канфэрэнцыя калгаснікаў.

Адклаў дзень ураджаю і калектывізацыі на 23 кастрычніка. На гэты раз Таміляў ны браў другі мотад. Надрукаваў новы цыркуляр, палажыў у кішэню дзесятні два гэтых шаперак, узяў машыну і паехаў па сельсаветах у якасьці кур'ера.

За дзень Таміляў аб'ехаў 10 сельсаветаў, кожнаму над расьпіску здаваў цыркуляр... Ён быў упэўнен, што пасьля такой «баявой» падрыхтоўкі, дзень ураджаю і калектывізацыі пройдзе на «вялікі подзем».

Надзеі дарэмныя. Усё засталося на старому. На месцах ніякай падрыхтоўчай работы ня было праведзена. Пастановы партыі і ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці, аб стварэньні зямляўстойлівага калгаснага ня ў калгасах ня былі прапрацаваны.

І гэта ў той час, калі ў раёне ёсьць звыш 20 агранамаў і дзесяткі зямельна-калгасных работнікаў. Райком партыі да сённяшняга дня не пераключыў работы зямельна-калгасных органаў у напрамку барацьбы за высокі ўраджай.

Урокі Рэчыцы павінны быць улічаны кожным раёнам. Дэкада ўраджаю і калектывізацыі, якая абвешчана ЦК КП(б)Б, павінна праходзіць пры шырокім і актыўным удзеле самых мас. Нельга жывую работу падмяняць бюракратычнай цыркулярнічаньнем. Не штампаваньне цыркуляраў, а тэмпы штодзённай канкрэтнай работы фермы з масамі, сярод мас забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне дэкады ўраджаю і калектывізацыі.

Данілевіч.

Уборка капусты і бручні ў прыгарадным гаспадарцы ТСТ імя Фабрыцыўса

400 заяў у КП(б)Б за адну дэкаду

ІНІЦЫЯТЫВА КАМУНАРАЎЦАЎ набывае масавы характар. Насустрач 15-й гадавіне Кастрычніка лепшыя рабочыя-ўдарнікі чэскіх прадпрыемстваў падаюць заявы ў КП(б)Б.

Менгаркам ухваліў ліст рабочых «Камунара» і **пастанавіў абвясьціць сталінскі заклік рабочых у партыю.**

Усімі парткалектывамі і ячэйкамі вакол дзовы камунараўцаў разгортваецца палітычна-масавая работа. На заводах і фабрыках праводзяцца спэцыяльныя вечары старых рабочых-ударнікаў, дзе прапрацоўваецца ліст рабочых заводу «**КАМУНАР**».

НА 28 КАСТРЫЧНІКА, наводзе вестак аргаддзелу Менгаркому КП(б)Б, у партыю **са старых рабочых-ударнікаў, у сувязі са сталінскім закліком, ПАДАНА КАЛЯ 400 ЗАЯЎ.** На абутковай фабрыцы ў партыю ўступіла 25 чалавек лепшых ударнікаў, якія працуюць на вытворчасьці па 10-15-20 і больш год. Рабочы **Ліхадзіеўскі** працуе на вытворчасьці 26 год, **Багданевіч**—28 год, **Пахамкос**—20 год, **Новікаў**—18 год і г. д.

49 лепшых ударнікаў падалі заявы ў КП(б)Б на заводзе імя **ВАРАШЫЛАВА.**

На фабрыцы «**УСХОД**» **пасьля прапрацоўкі пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і пасьля абгаварэньня ліста камунараўцаў**, толькі за адзін вечар **падана ў партыю 10 заяў.** Парткалектыў фабрыкі «Усход» разгарнуў вялікую работу на сталінскім закліку рабочых у партыю. Праводзяцца вечары старых рабочых-ударнікаў.

Ды ня толькі на гэтых прадпрыемствах. Вялікая работа па арганізацыі сталінскага закліку рабочых у партыю праводзіцца зараз на ўсіх заводах і фабрыках гораду Менску.

Ініцыятыву і пачын рабочых-кадравікоў чырвонасьцяжнага машынабудаўнічага заводу «Камунар», у Менску падхапілі ўжо па ўсіх прадпрыемстах. Сталінскі заклік дае добрыя вынікі.

Усе гарады і раёны БССР павінны падтрымаць пачын перадавікоў Менску. СТАЛІНСКІ ЗАКЛІК рабочых у партыю АРГАНІЗАВАЦЬ ПА ЎСЕЙ БССР!

Аб сталінскім закліку рабочых у партыю

Пастанова Менскага Гаркому КП(б)Б

Бюро Менскага гаркому КП(б)Б ухвалае ініцыятыву камунараўцаў аб арганізацыі сталінскага закліку рабочых у партыю.

Абавязаць усе парткалектывы і ячэйкі разгарнуць шырокую палітычна - масавую работу вакол адозвы рабочых «Камунара».

Сакратар Менгаркому КП(б)Б — ШПЭКТАРАЎ.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

* Сакратаром Віцебскага гаркому партыі выбран тав. Міцыноў, былы старшыня Калгасцэнтру БССР.

* Нарсудзэй польскай нацкамэры ў Менску зацьвярджан т. **М. Левандоўскі.**

* **У мыльнай імя XV гадавіны Кастрычніка** будаўнікі **Менску** перазаюць каля 300 новых кватэр.

* **Дом абароны** адкрываецца **ў Гомелі** ў будынку былога сабору.

* Перад Саўнаркомам БССР ставіцца пытаньне аб устаноўцы на Менскай электрастанцыі **новага турба-генэратара ў 3.000 квят.** Да 7 лістапада ўступае ў эксплёатацыю пяты кацёл.

* **Каля 5 млн. руб.** укладваецца ў чацьвертым квартале ў будаўніцтва камунальных прадпрыемстваў **Менску.** З гэтай сумы 1.072 тыс. руб. выдаткоўваюцца на мерапрыемствы па добрабыту.

* **«Беларускі фарватар»**, друкаваная газэта Белрайсаведу, пасьля паніцыі будзе перавядзена з Магілеву ў Гомель.

* **Скаланутая арцель «Рэкорд»**, Вузьдзенскага раёну — лепшая ў сыстэме прамкамбінатаў. Выхад пазіцыяру з кожнага ката ла замест звычайных 16 кгр., у сярэднім складае 18, а ў паасобных выпадках даходзіць да 24 кгр. На працягу лета арцель скончыла капітальны рамонт усіх 8 заводаў, загатовіла асмолу на ўвесь год і абзавялася ўласным транспартам.

* **Для пабудовы Дзяржцырку ў Менску** ад ведзен зямельны вучастак на тэрыторыі былой радыё-станцыі.

* Пры ЦСПСБ **арганізавана Беларускае міжсаюзнае бюро студэнцкіх секцый.** Раённыя бюро арганізуюцца ў Віцебску, Гомелі і Магілеве. Старшынёй аргбюро зацьвярджан тав. Патапенка.

* **Абвешчан грамадзкі агляд работы дзіцячых устаноў БССР.** За апошнія гады сетка бытавых дзіцячых устаноў надзвычай узрасла. Так у 1930 г. ясьлямі было ахоплена 3.000 дзіцей, а ў гэтым годзе— 6.000.

* **30.000 руб.** адпушчана для пабудовы ў Менску дому на 5 кватэр для ІТР-камунальнікаў.

* **Шэфства над будаўніцтвам кіно-камбінату** Белдзяржкіно прыняў Віцебскі камсамол.

* **Першая чарга каналізацыі Гомелю** заканчваецца будаўніцтвам да Кастрычніцкіх сьвят. Адначасова значна пашыраецца вадаправодная сетка.

„Пара стварыць умовы для працы“

(Ліст спэцыялістаў Насеннаводтрэсту)

Яшчэ два тады таму назад у Менску быў арганізаваны Беларускі насеннаводны трэст. Ня гледзячы на гэта, трэст ня мае яшчэ належнага памяшканьня.

У трэсьце налічваецца каля 45 супрацоўнікаў, якія працуюць у вільготным, цёмным і зусім малазьмім памяшканьні, у якім заўсёды капаюць пум, крык і штурханіна. Умоў для працы няма. За кожным сталом сядзяць па два-тры чалавекі.

Сярод супрацоўнікаў трэсту — 80 проц. высокакваліфікаваных спэцыялістаў. Тыя ўмовы, у якіх ім прыходзіцца працаваць, бязумоўна не даюць ім магчымасьці дабіцца высокай прадукцыйнасьці працы.

Мы ўжо некалькі разоў зварачаліся за дапамогай у Наркамзем, гарсавет, камгас. Вынікаў пяніх няма. Ніхто ня хоча паклапаціцца аб тым, каб забясьпечыць нас належнымі ўмовамі для працы. Ня так даўно інспэкцыяй працы была вылучана спэцыяльная брыгада, якая абсьледавала ўмовы працы ў трэсьце і прызнала, што памяшканьне трэсту не задавальняе нават мінімальных санітарных запатрабаваньняў.

Адсутнасьць належных санітарных умоў прывяла да таго, што значная частка супрацоўнікаў часта захворвае.

Дасылаючы гэты свой ліст у рэдакцыю, мы спадзяемся, што адпаведныя арганізацыі зьвернуць увагу на тыя ўмовы, у якіх прыходзіцца працаваць спэцыялістам і інш. супрацоўнікам насеннаводнага трэсту, і прымуць належныя захады для паляпшэньня іх.

Група спэцыялістаў насеннаводнага трэсту: **Бэрман, Крылоў, Шырко, Рафейчык, Трызна, Міронаў, Нестэровіч, Касабудзкі і інш. (ідуць 15 подпісаў).**

Вытворчая практыка сарвана

(Ліст студэнтаў)

Мы, студэнты 4-га патоку будаўнічага інстытуту, пасьля скончэньня тэарытычнага курсу былі накіраваны на практыку па будаўніцтве аўтагаражу і дому міліцыі ў Менску. Ня гледзячы на тое, што наша практыка павінна быць цесна зьвязана з тэорыяй, ніхто ня цікавіўся праходжаньнем на шай практыкі. Не праводзяцца тэарытычныя дні, а ўвесь час мы выконваем адвольную работу, якая нічога не дае нашай практыцы.

Зараз дырэкцыя інстытуту пачала з намі гуляць «у салдацікі». Будуецца буджамбінат на Камароўцы. Будаўніцтва праводзіў Менбуд, але неяк пасварыліся «Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам»—Менбуд адмовіўся працягваць работу і пачалася паміж названымі арганізацыямі «вайна»—раз ён ня будзе, адмовіўся,—мы забіром у яго (у Менбуда) усіх нашых студэнтаў. Так гэта і робіцца.

19-X нас зьнялі з практыкі з аўтагаражу і паслалі на камбінат. Дзесятнік адказаў нам, што работы для нас ён ня мае, апрача ачысткі двара і 9 пакояў. Па прыезьдзе ў інстытут, дырэктар для нас знайшоў працу—цьвікі драць. Бачыце, гэта, мабыць, вельмі добра падыходзіць для набыцьця практыкі, як будучым інжынэрам.

Ніякай падрыхтоўкі для правядзеньня работ няма, няма матар'ялаў, няма інструмантаў, адсутнічае спэцпрактка. Праўда, дырэктар т. Кунцэвіч загадаў заг. гаспадаркі зьняць брэзент з гары і аддаць краўчысе, каб... пашыла спэцпрактку. А пакуль мы робім вымушаныя прагулы, практыка наша зрываецца.

Мы лічым такое становішча зрывам работы.

Патрабуем арганізацыі належных умоў для працы-практыкі для таго, каб выхоўваць з кожнага з нас пралетарскага спэцыяліста.

Група студэнтаў 15 групы прамысловага будаўніцтва Будінстытуту.

Па сьлядох лістоў

(«Зьвязда» № 225) былога калгасьніка Арцюхова, Клімаўскі райкалгасаюз паведамляе, што факты, адзначаныя ў лісьце, пацьвердзіліся. У сувязі з дрэнным кіраўніцтвам у калгасе існавала безгаспадарчасьць. Партыйная ячэйка і сельсавет антрэтуністычна адносіліся да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу. **Пастановай РК КП(б)Б і прэзыдыуму РВК праўленьне калгасу, партыйная ячэйка і сельсавет распушчаны.** Старшыня калгасу за безгаспадарчасьць аддан пад суд, зараз усё кіраўніцтва абноўлена і новае праўленьне калгасу па-бальшавіцку ліквідуе шкоду і асеньняй сяўбе.

***

На лісту «**Чаму я вышаў з калгасу**»

Канавакапацель „ПААВА“ даў бліскучыя вынікі

Дэкада ўраджаю і калектывізацыі ставіць сваёй задачай выявіць усе формы і мэтады барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці. Мне-б хацелася на старонках «Зьвязды» падзяліцца вопытам, як трэба змагацца са стратамі ўраджаю ад вымаўкі азімых і яравых культур.

Гадоў пяць-шэсьць таму назад Аршанскі акрэсмаддзел невядома адкуль атрымаў канавакапацель. На адвале надпіс «ПААВА». Канавакапацель праляжаў у Аршанскім музэі да 1929 году. Потым машыну забрала мэліяратыўнае таварыства вескі **Пагост**, Тумініцкага сельсавету.

Таварыства пачало праводзіць вопыты выкарыстаньня канавакапацеля. Нічога ны вышла. Машыну проста кінулі на полі. Доўга яна там іржавела, раскрадаліся жалезныя часткі. Вясной гэтага году канавакапацель, як жалезны лом, забірае сабе старшыня калгасу «**Барацьбіт**». І тут для кузьні прыгадзіліся некаторыя часткі «ПААВА».

У жніўні месяцы я забіраю ўцалеўшыя часткі ў Аршанскую МТС. Прашу адраманТаваць канавакапацель. Загадчык машынатрактарнай майстэрні ды адказ: «Вязі ты яго лепш у прыватную кузьню, або здай на ўцільсырац, а мы рамантаваць ня будзем». Работнік Беларданяленьня Трактарацэнтру Собалеўскі даў яшчэ лепшую параду: «Вязі ў Горадзкую або Касьцюковіцкую МТМ, там табе адрамантуюць». Так адказвалі галавацяпы, так яны сустракалі маю ініцыятыву.

Я вымушан быў сам шукаць мэханіка, каб на свае сродкі ў перабочы час адраманТаваць канавакапацель. Мне пашоў насустрач мэханік тав. **Хачкоўскі.** З прычыны хваробы ён ня скончыў рамонту. І толькі новапрыбыўшы ў Аршанскую МТС малады мэханік канчаткова скончыў рамонт машыны.

Парэшце, пасьля доўгай цяганіны, 22 верасьня я прыступіў да правядзеньня вопытаў з канавакапацелем «ПААВА». Скарыстаўшы ў якасьці цягавай сілы трактар «Інтэр» 13/30, я атрымаў бліскучыя вынікі.

Складаецца трактарны атрад з 3-х інтэраў пад назвай **мэліяратыўнага атраду.** На яго ўскладаюцца абавязкі: асушка заблочаных і бросавых земляў, а таксама падсёка цаліны. Аршанская МТС распачала барацьбу з вымачкай азімых, шляхом выкарыстаньня канавакапацеля і мэханічнай цягавай сілы.

У калгасе «**Чырвоны кут**» і «**Чырвоная Яромкавічы**» ад вымачкі гінула 60 проц. ураджаю. Да 13 кастрычніка тут выкапана 14 клм. канаў, асушана 380 га пасеваў плошчы.

Канавы тэхнічна здавальняючыя. Яны паваг не патрабуюць падчысткі. Шырыня канавы па верху 1 мэтр, па дне — 0,10 мэтраў, глыбіня—0,55 мэтраў.

На вопыце мною ўстаноўлена, што канавакапацель дае найвышэйшую эфэктыўнасьць пры спаранай цягавай сіле на буксіры двух інтэраў 15/30 (або трактары «Манарх»). Пры такой цязе за дзень можна выкапаць каля 6 клм. канавы. У дзень вымаецца да 2.100 кбм. зямлі, вызваляецца ад ручной работы 400 гарбароў, эканоміцца каля 2.000 руб.

За летні сэзон (100 дзён) адзін канавакапацель дасьць эканоміі на 100 тыс. руб., вызваліць ад цяжкай працы 40 тыс. гарбароў, асушыць 9.000 га пасеўнай плошчы.

Па БССР з году ў год вымочваецца ад 30 да 35 проц. пасеву. Калгасы свой мэліяратыўны плян выконвалі ў 1931-1932 г. ня больш як на 10-15 проц. Пры выкарыстаньні-ж канавакапацеля «ПААВА» (а яго можа зрабіць кожная звычайная майстэрня МТС), размах мэліяратыўных работ прымо такія тэмпы, што ў бліжэйшыя адзін-два гады можна будзе канчаткова ліквідаваць вымачку пасеваў.

Наркамзем БССР павінен падхапіць вопыт Аршанскай МТС, забясьпечыць канавакапацелем кожную машына-трактарную станцыю, даць ёй кантрольнае заданьне па мэліярацыі і асушцы заблочаных земляў. Пры існуючай мэханізацыі сельскай гаспадаркі мы маем усе ўмовы і магчымасьці для таго, каб пасьвіці больш рашучую барацьбу з вымачкай пасеваў, атрымаць больш высокі ўраджай.

Агрэмэліяратар Аршанскай МТС— **Стрэльскі.**

РАЗГОРТВАЮЧЫ МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ—ПІКВІДУЕМ АДСТАВАНЬНЕ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ У ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

Ход збожжазагатовак па БССР

Здана на 25 кастрычніка

(У ПРОЦАНТАХ . А ГАДАВЗГА ПЛЯНУ)

Калгасы МТС	Інш. калгасы	Аднаасобнікі	Загатоўлена	Разам з насеннязыкай
84,3	60,3	33,2	49,1	41,4

***

Апошняя зводка. аб збожжазагатоўках гаворыць аб усё яшчэ нездавальняючым ходзе кампаніі. Дамабілізацыйныя настроі, якія пануюць у радзе раёнаў, адмоўна адбіваюцца на тэмпах загатовак.

За пятую пяцідзеўку кастрычніка здана 2.171 тоны — кастрычніцкі плян выкананы на 60,4 проц. (без звароту насеннязыкі).

Калгасы МТС ідуць на першым месцы, здаўшы 84,3 проц. заданьня. Адстаюць ад іх калгасы, падпарадкаваныя райкалгассаюзам, якія здалі 60,3 проц. Вельмі дрэнна зьбіраецца насеннязыка па калгасах. Да 25 кастрычніка выкананa 6,1 проц. гадавога заданьня.

Зноў прыходзіцца канстатаваць адставаньне аднаасобнага сэктару, які ўвесь час зьяўляецца самым слабым вучасткам кампаніі. Аднаасобнікі выканалі гадавы плян на 33,2 проц. — у два разы менш чым калгасы БССР.

Трэба папярэдзіць раёны, што спасыланьне на адгрузку бульбы, у якасьці «аб'ектыўнай прычыны» для аграўданьня нізкіх тэмпаў здачы збожжа, ні ў якім разе ня можа быць прынята пад увагу. Побач з фарсаваньнем адгрузкі бульбы трэба няўхільна гнаць угору крывую збожжазагатовак. Усякія дамабілізацыйныя настроі нямінуча прыводзяць да зрыву загатоўчага пляну.

Наогул гадавы плян збожжазагатовак па БССР (без насеннязыкі) выкананa на 49,1 разам з насеннязыкай — на 41,4 проц. Задача дня — падвоіць, патроіць тэмпы загатовак, аддаўшы максымум увагі збору насеннязыкі і памольнага збору.

Абвешчан дэкаднік штурму

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Калі мінулыя пяцідзеўкі давалі рост тэмпаў збожжазагатовак на 6-7 проц., дык апошнія пяцідзеўкі далі павялічэньне на 2, максымум на 4 проц.

«Зьвязда» пісала ўжо аб памылках, дапушчаных магілеўскім гарпомам партыі ў збожжазагатоўках. Бюро раённага камітэту партыі, якое разгледзела артыкул «Зьвязды», прызнала яго зусім правільным.

Адмоў, райком яшчэ не палажыў гібкага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам загатовак, і тэмпы ўсё яшчэ застаюцца нездавальняючымі.

Слаба дагэтуль праводзіцца масавая работа. Есьць рад выпадкаў ігнараваньня растлумачальнай работы і замены яе адміністраваньнем. У Мастоцкім сельсавеце старшыня яго сам хадзіў па дамох і забіраў збожжа.

5 кастрычніка на пашыраным пленуме РВК, з удзелам старшыні ЦВК тав. Чарвякова, большасьць старшынь сельсаветаў абяцалі выканаць да 10 кастрычніка 50 проц. гадавога пляну. Адмоў абяцаньне засталося на паперы.

Зусім дрэнна паступае збожжа ад кулацка-заможных элементаў. На 20 кастрычніка паступіла 19,6 проц. Гэта гаворыць аб адпушчасьці націску на кулака. Кулак, карыстаючыся патураньнем з боку сельсветаў, разбазарыў значную частку збожжа. Кулак Якуб Зайцаў (Гусьлішчанскі сельсавет), які ашукаў здаць 150 пуд. бульбы і 22 пуды збожжа і які жыве побач з сельсветам, упарта сабатуе выкананьне цьвёрдых заданьняў.

Добры прыклад работы паказваюць калгасы МТС, якія выканалі 78 проц. пляну.

Калгасы, якія абслугоўваюцца трэцім вучасткам, на чале якога стаіць тав. **Рушкаў**, яшчэ да 15 кастрычніка поўнасьцю здалі як збожжа, так і бульбу.

Райком партыі з 25 кастрычніка абвясьціў дэкаднік штурму прадпраў па загатоўках. Мабілізаваць большая частка партыйнага і камсамольскага актыву, якая выехала ў сельсаветы для палажэньня работы.

Здача збожжа аднаасобнікамі вёскі ФЭЛІЦЫЯНАВА, ПУХАВІЦКАГА РАЁНУ

Калгас „Інтэрнацыянал" разбазарыў 14 тон памольнага збору

Абсьледаваньне ходу памольнага збору на **Капыльскім раёне** выявіла факты злачыннага разбазараваньня гарнца.

Дагэтуль на быў усталёўлен сыстэматычны кантроль за зборам гарнца. Каля 100 тон памольнага збору ляжала нявывезеным на млынах. Калгас «Інтэрнацыянал» разбазарыў 14 тон гарнца. На прыёмных пунктах няма дакладнага ўліку паступленьня памольнага збору. Белазагазбожжа дагэтуль ня прыняло мер, каб забясьпечыць млыны квітанцыйнымі кніжкамі на прыёмцы гарнца.

Упаўнаважаны камітэту загатовак па БССР настаяў за разбазараваньне памольнага збору прыцягнуць да судовай адказнасьці былога старшыню калгасу «Інтэрнацыянал», зараз старшыню Грозаўскага сельсавету — **Зубарава** і цяперашняга старшыню калгасу **Бохана**, а таксама райкантралёра **Мароза**, які падбойна аднёсься да сваіх абавязкаў і ні разу не абсьледаваў млыну калгасу «Інтэрнацыянал».

Упаўнаважаны камітэту загатовак звярнуўся да пракуратуры рэспублікі з просьбай разгледзець гэту справу ў паказальным парадку.

Пад уплывам кулацкіх тэндэнцый

ВУШАЧЫ. Плян збожжазагатовак па раёне выкананa толькі на 22 проц. Пасобныя сельсаветы і калгасы недаацэньваюць пытаньня збожжазагатовак. Прыкладам можа служыць **Чарапоўшчынскі** сельсавет, які здаў толькі 14 проц. заданьня. Партыйчэйка гэтага сельсавету не ўзначаліла барацьбы за збожжа, не мабілізавала масы на адпор кулацтву і яго агентуры, якія імкнуцца сарваць выкананьне пляну.

Асабліва адстае калгас імя Сталіна, Есьпінскага сельсавету, дзе не загатоўлена ні аднаго кілё збожжа. Праўленьне гэтага калгасу падпала пад уплыў кулацка-спажывецкіх тэндэнцый.

Сагрэўшы ўлор бацькоўскай работы паказвае калгас «Чырвоная Зьмена», Зарачанскага сельсавету, які, на аснове правільнага спалучэньня мабілізацыі і загатовак, яшчэ да 1 кастрычніка поўнасьцю выканаў плян збожжазагатовак у 28,2 цэнтн. Гэты калгас да 5 га кастрычніка ўбраў усю бульбу і адгрузіў пятнаццаць Ленінграду 2,5 тон.



НА КАЛГАСНЫМ РЫНКУ У МЕНСКУ
НА ЗДЫМКУ: Калгасьнікі купляюць калёсы

Заўтра адкрываецца калгасны кірмаш у Менску

Перад кірмашам

Па пляну Парыскай Камуны ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да калгаснага кірмашу, які пачынаецца 30 кастрычніка. З самай раніцы ідзе перакідчка вострых сякер і малатоў. Зьлёк чуць нарэзкі папяровых піл.

Будуецца рад ларкоў, крам і паказальняў. Маюць плянаваць шодугіюжные набудову трох чайных, двох сталовак, кніжных кіёскаў, паходных музыкаў, рамонтных майстэрань, пункту, бюро даведак, апчадкасы Дзяржбанку, пяці радыё-пунктаў.

У цэнтры — прыкмеры ларок механічна-гаспадарчага адзяленьня Белкаапсаюзу. Праз дзень ён павінен запоўніцца шафамі, сталамі, жалезнымі ложкамі, кроснамі, матрацамі і інш. Больш дзесятка шафаў ужо заняли свае месцы ў ларку. Побач, з правага боку, ідзе будаўніцтва ларку дрэзінпрацаўчага заводу імя Молатава; зьлева — крама сінтэтычнага адзяленьня Белкаапсаюзу. Частка тавараў — фарфаравае, фаянсавае, эмаляванае пасудзьне, лямпы, шыпкіны вырабы ўжо прыбылі. Сінтэтычнае адзяленьне выступае на кірмашы з 6 гандлёвымі адзінкамі.

Набудован ужо ларок адзяленьня «Мануфактура і дзіця». Канчаецца ларок таварыства «Прыхільнік дзяцей».

Белсельгаснаб і ТСТ ва ўдарным парадку канчаюць будаўніцтва ларкоў.

Сёньня адбудзецца генэральны агляд падрыхтоўкі да міжрайоннага калгаснага кірмашу.

І. Т.

Шырэй разгарнуць калгасны гандаль

Камісія выканаўчага пры СНК БССР канстатуе значнае аслабленьне ўвагі да пытаньняў калгаснага гандлю з боку раду савецкіх, гаспадарчых, кааперацыйных і калгасных арганізацый.

Пляны разгортваньня гандлёвай сеткі калгасаў і саўгасаў, асабліва ў глыбінных пунктах, ня выкананы: па калгаснай сыстэме замест 849 адзінак адкрыта 438, па саўгасах замест 73 адзінак адкрыта 56. Таксама нездавальняюча выконваецца плян адкрыцьця ларкоў на базарах. На Белкаапсаюзе замест 335 адкрыта 277 ларкоў, па Белгандлі замест 99 адкрыта 83 ларкі; па прамкаапсаюзы пры колькасным выкананьні пляну галоўная частка гандлёвых адзінак згрунавана ў цэнтральных частках гарадоў.

У верасьні штучны тавараварот зьнізіўся ў параўнаньні з папярэднімі месяцамі (л'нень—жнівень).

Базы прамысловасьці ўсё яшчэ засылаюць у вёску тавары непадыходзячага асартыменту (Віцебская база Саюзтрыкатажу выкапала 90 проц. пляну заводу пантох), а гандлёвыя арганізацыі не вядуць належнай барацьбы за паляпшэньне асартымэнту і якасьці завезеных тавараў.

Гарсаветы раду гарадоў (Барысаў, Ворша, Магілеў, Бабруйск і інш.) ня ўжылі належных захадаў да ўпарадкаваньня базарных плошчаў і паляпшэньня культурнага выгляду савецкіх базараў.

Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб выкананьні начальнікаў базараў ні адным гарсаветам ня выканана.

Ёсьць шмат выпадкаў ілгнага скажэньня прыкладнага кааперацыі пры арганізацыі суспрочнага гандлю на савецкіх базарах: дапушчэньне таваразабмену (Гомель, Магілеў, Ворша, Смалявічы), ужываньне прымусовага асартымэнту тавараў (Магілеў), адміністраваньне ў прымацаваньні калгасаў да загатоўчых арганізацый на збыт зьвышпланавай прадукцыі (Мазыр), адміністрацыйнае рэгуляваньне цэн (Віцебск) і г. д.

Фінансавыя органы, РВК, гарсаветы і органы мілыцыі яшчэ недыстарчальна вядуць барацьбу з перакупшчыкамі і спэкулянтамі, якія імкнуцца нажыцца на калгасным гандлі.

Слаба праводзіцца барацьба са скажэньнем дзяржаўнай палітыкі цэн. Паасобныя дзяржаўныя і кааперацыйныя арганізацыі робяць ажыятаж на рынку, узгуваючы цэны ў гатым грашоў на руку спэкулянтам.

Гандлёвыя і кааперацыя арганізацыі, з таксама рад РВК яшчэ ня зусім ўзялі справу разгортваньня савецкага гандлю з адпачай спалучэньня і поўнага выкананьня пляну дзяржаўных цэнтралізаваных загатовак, процістаўчы адно другому. У выніку, тэмпы выкананьня цэнтралізаваных загатовак адстаюць ад тэмпаў здачы прадпрыемствамі ў вёску. Цэнтралізаваныя сакзаны і тоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў разгортваюцца вельмі слаба.

Камісія выкесла рад канкрэтных прапаноў, якіх накіраваны на зьлічэньня ўсіх выяўленых недахопаў.

Напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят

Поўным выкананьнем пляну бульбы і збожжа-загатовак сустрэць XV гадавіну Кастрычніка

Гомельскія паравозьнікі ўступілі ў спаборніцтва з рабочымі М. Курскай чыгункі

Ліст рабочых Маскоўска-Курскай чыгункі глыбока прапрацаваны сярод рабочых, ІТР і служачых дэпо Гомель. Выклік рабочых Маскоўска-Курскай прыняты. У сваім адказе рабочыя дэпо Гомель, прымаючы рад абавязацельстваў, спыняюцца на тых посьпехах, якія дасягнуты да 15-ай гадавіны Кастрычніка.

Гомельскае дэпо ў першым усесаюзным конкурсе заняло першае месца па пасажырскіх і таварных паравозах. За лепшую работу дёпо прамініваны пераходным сьцягам, які замацавалі і ў 2-м Усесаюзным конкурсе. Па другім усесаюзным конкурсе ўсе тры паравозы, якія спаборнічалі, былі прамініваны.

З посьпехам закончан спэцыяльны рамонт паравозаў. Заданьне перавыкананa, на 8 адзінак і на тры дні раней тэрміну. Есьць значнае зьніжэньне процанту хворых паравозаў. Так, у верасьні пры заданьні 11,41 проц., было 9,4 проц. без заводскага рамонту і 10,6 проц. — пры заданьні 12,3 — паравозаў з заводзкім рамонтам. Значна зьнізіўся прастой паравозаў у абточцы. Так, у верасьні прастой у адну зьмену ў суткі склаў 5,1 проц. пры заданьні 6,4. Есьць дасягненьні і па лініі павялічэньня сярэднясутачнага прабегу паравозаў, карыснай яго работы ў гадзінах і г. д. Даволі шырока разгорнута тэхнічная вучоба. Тэхнічнымі гурткамі ахоплена 61 проц. рабочых. Рабочы калектыў дабіўся таксама значных посьпехаў у справе паляпшэньня бытавых умоў. У гэтым годзе адрамантавана сталовая, набудавана гарадзяхавальня па 150 тон, канчаецца будаўніцтвам сьвінарнік, закуплена 20 сьвіней і 10 шт. буйной рагатай жывёлы.

Вялікую дапамогу ў рабоце дэпо аказвае арганізацыя ўніцыях. Ён дапамог зьлічыць труднасьці з запаснымі часткамі, што дало эканомію больш 6.000 руб. Апрача таго, за час з 8 жніўня на 1 кастрычніка перадана праз кааперацыю на рынак прадукцыі шырэйшаму на 1.250 уб.

Работы дэпо адзначаюць падрыхтоўку да XV гадавіны павышэньнем тэмпаў работы, сустрэчнымі самабавязацельствамі. Цэх па прамысловым рамонце узяў абавязацельства выпусьціць звыш заданьня 5 паравозаў на халоднай і гарачай прамыўцы. Абавязацельства выкананa дагэтаднова. Выпускае адзін паравоз звыш заданьня і цэх абточкі. З 15 верасьня пачаўся ўнутрыдэпоўскі конкурс на лепшую спараную і рамонтную брыгаду.

У сваім адказе рабочыя гомельскага дэпо пішуць: «Даем вам пралетарскае абяцаньне, што завалаваныя намі дасягненьні замацуем і дабіўся па 3-м усесаюзным конкурсе яшчэ лепшых паказальнікаў у барацьбе за пасляховае выкананьне пляну асенньга-зімовых перавозак і за ўдасканаленьне чыгуначнага транспарту».

Рабочыя Гомельскага дэпо, пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі, будуць змагацца за новыя посьпехі ў 3-м усесаюзным конкурсе, за замацаваньне за дэпо пераходнага сьцягу, за перадавыя месцы сярод лепшых спараных брыгад СССР.

Р.

31 кастрычніка ў 6 гадзін вечара ў габінэце тав. ШАРАНГОВІЧА

адбудзецца

ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

Цэнтральнай камісіі па правядзеньні сьвяткаваньня 15-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Рыхтавацца так, як Заслаўскі раён

(На пасяджэньні Цэнтральнай Кастрычніцкай камісіі при ЦК КП(б)Б)

Масавая падрыхтоўка да XV-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі разгортваецца па ўсіх раёнах БССР. Выкананьнем і перавыкананьнем пляну, баявой рэалізацыяй абавязацельстваў па лісту ленінградзкіх рабочых сустракаюць перадавікі XV Кастрычніка.

Бялікая падрыхтоўчая работа праводзіцца ў **ЗАСЛАЎСКІМ раёне.** Яна ўвязваецца з задачамі выкананьня гаспадарча-палітычных кампаній. Партарганізацыя зьвярнула асобную ўвагу на збожжа-бульбазагатоўкі. Заслаўскім райкомам КП(б)Б, ужо больш месяца назад накіраваны на ўсе сельсветы ўказаньні работнікі, спэцыяльна па падрыхтоўцы да кастрычніцкіх дзён. Сярод калгаснікаў, бедняцтва і серадняцтва—аднаасобнікаў праводзіцца шырокая масава-растлумачальная работа. Ліст ленінградзкіх рабочых прапрацован у кожным калгасе, на кожным вясковым сходзе.

У выніку плян адгрузкі бульбы Ленінграду па Заслаўскім раёне выкананa на 100 %. Заслаўскі камсамол у дні Кастрычніка адгружае ЛЕНІНГРАДЗКАМУ камсамолу звыш пляну адзін вагон бульбы.

Плян збожжазагатовак ў гэтым раёне на 20 кастрычніка быў выкананa на 55,8 проц. Праводзіцца работа па завяршэньні пляну загатовак збожжа да 7 лістапада.

Значная работа праведзена ў Заслаўскім раёне і на іншых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Загатоўна гародзіны будзе хутка закончана, заданьне ўжо выкананa на 95 проц.

Плян мабілізацыі сродкаў апошняга кварталу будзе да 7 лістапада выкананa на 60-70 проц. У м. Заслаўі канчаецца будаўніцтва дому культуры, адкрыцьцё якога прысьвячана да XV-годзьдзя Кастрычніка.

Грамадзкія арганізацыі Заслаўшчыны так сама разгарнулі вялікую работу. Таварыствам «Прэч непісьменнасьць» абвешчан масавы кастрычніцкі набор новых членаў. За апошнія дні ўжо ўступіла 315 чал.

Значна горш ідзе падрыхтоўка да Кастрычніцкіх сьвят у **АСІПАВІЦКІМ раёне.** Плян збожжазагатовак у гэтым раёне выкананa толькі на 40 проц., а плян адгрузкі бульбы —усяго на 36 проц. Нарастаньне тэмпаў нездавальняючае. Есьць нагроза, што да XV-годзьдзя Кастрычніка плян загатовак збожжа і бульбы ня будзе выкананa. Слаба разгорнута масавая работа.

Толькі зараз Асіпавіцкі РК КП(б)Б прыняў рад канкрэтных мер для таго, каб узмацніць тэмпы выкананьня збожжа і бульбазагатоўчых пляноў. У сельсаветы накіравана 40 адказных работнікаў. Партарганізацыя Асіпавіцкага раёну павінна ўсямерна ўзмацніць падрыхтоўку да Кастрычніцкіх сьвят.

Цэнтральная кастрычніцкая камісія заслухала даклады вайсковых часьцей.

Падрыхтоўка да XV-годзьдзя Кастрычніка па вайсковых часьцях разгортваецца надзвычай добра.

Палітвучоба ў РСЧА ўзьнята на належную вышыню. Агляд чырвонай казармы паказвае масавы характар.

Асаблівую ўвагу партыйная арганізацыя вайсковых часьцей зараз зьвяртае на паляпшэньне быту чырвонаармейцаў.

Але дрэнна тое, што ня сёньняшні дзень многія грамадзянскія арганізацыі (асабліва ў Магілеве, Віцебску, Быхаве і інш.) вельмі мала дапамагаюць вайсковым часьцям у падрыхтоўцы да Кастрычніка.

ЦК Чырвонага крыжу БССР XV-годзьдзе Кастрычніка сустракае адрыцьцём 4-х новых дамоў адпачынку для Чырвонай арміі. Цэнтральны камітэт Чырвонага крыжу зараз праводзіць **масавы дэкаднік паходу за чыстату чырвонай казармы.**

У.

КАНЕЦ СТАБІЛІЗАЦЫІ КАПІТАЛІЗМУ І ПЕРАХОД ДА НОВАГА ТУРУ РЭВАЛЮЦЫЙ І ВОЙНАЎ

Урад Папэна-Шлейхэра паставіў пытаньне аб роўнапраўі Германіі ва ўзбраеньнях. Германскі ўрад зьвярнуўся з афіцыяльнай нотай да францускага ўраду, які на чале з Эрыё, як і трэба было чакаць, адхіліў германскае патрабаваньне. «Не, ніколі, немагчыма» — адказаў Эрыё па патрабаваньне германскага ўраду адносна прызнаньня за Германіяй права на роўнапраўе ва ўзбраеньнях. Зразумела, патрабаваньне роўнапраўя ва ўзбраеньнях зьяўляецца толькі адным з першых крокаў фашысцкага ўраду, і Папэн нават ня ўтойвае гэтага; ён ужо зрабіў намёк на тое, што пасьля пытаньня аб узбраеньні будзе пастаўлена пытаньне і аб праве Германіі на ўладаньне калёніямі, г. зн. пытаньне аб перадзеле калёній. Каб падмацаваць сваю рашучасьць, германскі ўрад ужо даў загад аб закладзе новых браняносцаў.

Францускі імпэрыялізм адказвае на толькі заявамі Эрыё — «не, ніколі, немагчыма», ня толькі пагрозай, што будуць апублікаваны дакументы аб патаемных узбраеньнях Германіі, але і ваеннымі манэўрамі на германскіх межах. І не выпадкова, што ў Польшчы адначасова з выступленьнем Германіі ўзмацняецца антыгерманская кампанія, ставіцца пытаньне аб захваце Данцыгу.

Германскі імпэрыялізм патрабуе роўнапраўя. Гэта патрабаваньне азначае, што Германія зноў хоча заняць «ганаровае» месца ў грамадзтве буйнейшых імпэрыялістычных дзяржаў, якія рабуюць сьвет. Германская буржуазія лічыць, што наступіў час, калі яна можа ставіць пытаньне аб аднаўленьні Германіі ў якасьці поўнапраўнай імпэрыялістычнай дзяржавы. Зразумела, францускі імпэрыялізм выступае супроць германскіх патрабаваньняў, італьянскі-ж імпэрыялізм адкрыта падтрымлівае германскія патрабаваньні, а НАЗШ выкарыстоўваюць германскія патрабаваньні ў якасьці сродку націску на канфэрэнцыю па разбраеньні. Англія-ж вядзе дыпляматычную гульню. Яна падтрымлівае пазыцыю Францыі ў такой форме, каб вырваць у не вядомыя ўступкі. Ва ўсякім выпадку тыя падзеі, якія разгортваюцца вакол пытаньня аб германскіх патрабаваньнях роўнапраўя, паказваюць, што блёк вэрсальскіх дзяржаў **РАСПАДАЕЦЦА.**

Франка-германскія, а тым самым і польска-германскія супярэчнасьці сталі крыніцай буйнейшых міжнародных канфліктаў. І вэрсальская сыстэма і Ліга нацый увайшлі ў паласу крызісу. Ужо гэта — важны элемэнт канца капіталістычнай стабілізацыі.

На Далёкім Усходзе Японія пачала ўжо імпэрыялістычную вайну і зараз выступіла з прызнаньнем «новай дзяржавы» Манчжурыі, так званага Манчжоу-го. Прызнаньне Манчжоу-го японскім урадам, дагавор паміж японскім урадам і марыянэтачным урадам Манчжоу-го азначаюць ператварэньне Манчжурыі ў поўную калёнію японскага імпэрыялізму. Імпэрыялістычныя супярэчнасьці па Далёкім Усходзе гіганцкі абвастрыліся і яшчэ больш абвастраюцца ў сувязі з прызнаньнем Японіяй манчжурскай дзяржавы. Японскі друк, і ня толькі японскі друк, але і японскія міністры проста ставяць пытаньне аб магчымай вайне паміж ПАЗШ і Японіяй. Друк у ПАЗШ не выступае настолькі адкрыта, але і там ставіцца пытаньне аб канцы эпохі 9 дзяржаў, аб неабходнасьці ўмацаваньня важнейшых стратэгічных пунктаў на Ціхім акіяне, умацаваньне якіх было забаронена вашынгтонскім дагаворам. Адкрытае падтрыманьне Францыяй японскага імпэрыялізму на Далёкім Усходзе зьяўляецца лепшым пацьвярджаньнем таго, што паміж Францыяй і Японіяй заключан ваенна-палітычны саюз. Заключэньне гэтага саюзу азначае, што пачынаюць складацца новыя групоўкі, новыя ваенна-палітычныя саюзы, якія пачалі ўжо імпэрыялістычную вайну і нічыльна падводзяць імпэрыялістычныя краіны да ваеннай інтэрвэнцыі ў СССР.

Англія, маючы буйнейшыя імпэрыялістычныя супярэчнасьці з Японіяй, фактычна нягласна падтрымлівае японскае ўварваньне ў Кітай як падрыхтоўку да інтэрвэнцыі ў СССР.

Даклад камісіі Літона і барацьба, якая разгарэлася паміж імпэрыялістамі вакол дакладу паказваюць, што гутарка ідзе ня толькі аб Манчжурыі, а аб падзеле ўсяго Кітаю, аб міжнародным кантролі над Кітаем, аб інтэрвэнцыі супроць кітайскіх Саветаў.

Падзеі апошніх дзён у галіне міжнароднай палітыкі наглядна асьвятляюць **КАНЕЦ** стабілізацыі ў міжнародных адносінах. Ці значыць гэта, што супярэчнасьці ў лягеры імпэрыялістаў зьнімаюць пытаньне аб непасрэднай пагрозе ваеннай інтэрвэнцыі ў СССР? Наадварот. Толькі апартуністы могуць думаць, што чым больш абвостраны супярэчнасьці ў лягеры імпэрыялістаў, тым менш магчыма ваенная інтэрвэнцыя ў СССР. Правільная пастаноўка гэтага пытаньня заключаецца іменна ў тым, што абвастраньне супярэчнасьцяй у лягеры імпэрыялістаў **УЗМАЦНЯЕ** тэндэнцыю вырашыць гэтыя супярэчнасьці за кошт СССР.

Пэрыяд «перадышкі» ў барацьбе двух сьветаў, відавочна, канчаецца.

Мы перажываем пераход да новага туру войн і інтэрвэнцый. Гэта будзе разам з тым пераход да новага туру рэвалюцый. Канец стабілізацыі міжнародных адносін зьяўляецца адлюстраваньнем надзвычайнага абвастрэньня супярэчнасьці паміж бурным ростам сацыялізму ў СССР і глыбокім эканамічным заняпадам у капіталістычных краінах. Эканамічны крызіс, вырастаючы на аснове ўсагульнага крызісу капіталізму, абвастраю ў сваю чаргу гэты крызіс. Ён ня толькі ліквідаваў усе дасягненьні часткавай і часовай капіталістычнай стабілізацыі, але адкінуў прамысловую прадукцыю важнейшых капіталістычных краін на 30—40 год назад і асушыў шырэйшыя пласты рабочых і працоўных мас на голад. Гэта зьяўляецца эканамічным праяўленьнем канца капіталістычнай стабілізацыі.

Разам з тым канец капіталістычнай стабілізацыі адначасова зьяўляецца адлюстраваньнем надзвычайнага абвастрэньня клясавых антаганізмаў у капіталістычных краінах на фоне глыбачэзнага эканамічнага крызісу. Гэта абвастраньне антаганізмаў знаходзіць сваё праяўленьне ў хуткім росьце фашызму на адным полюсе, у хуткім нарастаньні рэвалюцыйнага пад'ёму — па другім. Рэвалюцыйны пад'ём нарастае **НЯРОЎНАМЕРНА.** Але гэта — зьявіча ўсеагульнае, міжнароднае і яно складае найбольш глыбокую аснову сканчэньня капіталістычнай стабілізацыі. Асабліва сымптаматычна, што бурнае абурэньне мас работніка прарываецца там, дзе нядаўна яшчэ панавалі як быццам ціш да гладзь.

Гераічная стачка бэльгійскіх гарнякоў, якая адбывалася больш двух месяцаў, скончылася. Але гэта стачка выявіла ўсю глыбіню таго бражэньня, якое адбываецца ў масах нават у такіх краінах, як Бэльгія, якія не адзначаюцца асаблівай вострасьцю клясавых баёў за апошнія гады. Стачка гарнякоў і мэталістаў у Бэльгіі выявіла, што ў нетрах рабочае клясы выпрацоўваецца новы рэвалюцыйны актыў, што расчараваньне палітыкай сацыял-дэмакратычных правадыроў і рэфармісцкай бюракратыі няўхільна **РАСЬЦЕ.**

Уже шчыльна падыходзіць да рэвалюцыйнага крызісу Польшча. У Польшчы пасьля цэлай хвалі эканамічных стачак, перарослых у палітычныя, — новы пад'ём стачачнай хвалі, якая ў большасьці выпадкаў узначальваецца кампартыяй. Стачкі ў Гдыні, у нафтавых раёнах, стачкі камунальнікаў, стачкі на радзе буйных мэталюргічных заводаў, нядаўнія сялянскія рэвалюцыйныя выступленьні ў Заходняй Украіне, Зах. Беларусі і ў карэнных Польшчы — усё гэта паказвае, што ў Польшчы рэвалюцыйны рух мас узьнімаецца на ўсё больш высокую ступень, і нават надзвычай далёка ідучыя «левыя» манэўры ПНС ня могуць спыніць развіцьця рэвалюцыйнага пад'ёму.

У Германіі габінэт Папэна-Шлейхэра распусьціў рэйхстаг. Германія — зноў перад выбарамі. Гэта будзе пятая буйная выбарчая кампанія ў Германіі ў бягучым годзе. Фінансавая алігархія і буйныя юнкеры ніколі яшчэ не ажыцьцяўлялі ў Германіі настольга адкрыта, настолькі агалцела сваю непасрэдную дыктатуру, як у цяперашні момант. У той-жа час разгон рэйхстагу сьведчыць аб вострых спрэчках у лягеры самой буржуазіі. У той-жа час посьпех антыфашысцкай кампаніі германскай кампартыі і 5.300.000 галасоў, паданых за яе на апошніх выбарах, паказваюць, як хутка сьпее суб'ектыўны рэвалюцыйны фактар у Германіі. Германская сацыял - дэмакратыя бясспрэчна паспрабуе адвесьці пасьпяшную вострую барацьбу супроць надзвычайнага дэкрэту Папэна, супроць адкрытай фашысцкай дыктатуры ўраду Папэна-Шлейхэра ў рэчышча выбарчай кампаніі, рэферэндуму і іншыя дэмакратычныя рэчышчы, каб адцягнуць масы ад сапраўднай барацьбы на фабрыках, на заводах, на вуліцах. Але можна ня сумнявацца ў тым, што цяжкі ўдар, нанесены буржуазіяй пралетарыяту ў выглядзе зьніжэньня зарплаты, у выглядзе пагрозы зьніжэньня сацыяльных дапамог, дапамога кампартыі ўзьняць на-за паляманцкую пралетарскую барацьбу. **Германія цяжарна буйнейшымі клясавымі боямі.**

У Гішпаніі ўжо больш году працягваецца рэвалюцыя. Гераічная рабочая кляса Гішпаніі разьвіла вялізарную рэвалюцыйную энэргію. Рэвалюцыйная барацьба гарадзкіх рабочых падымае вёску: у ёй хутка насьпяваюць элемэнты аграрнай рэвалюцыі.

У той-жа час у Кітаі — новы выбух антыяпонскага байкоту, новы выбух антыімпэрыялістычнага масавага руху ў гамінданаўскім Кітаі і новыя перамогі рабоча-сялянскай чырвонай арміі і кітайскіх саветаў.

Хуткае нарастаньне рэвалюцыйнага пад'ёму — нясумненны факт, і іменна яно зьяўляецца важнейшым фактарам канца капіталістычнай стабілізацыі.

Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня сходаў, прысьвечаных пятнаццацігодзьдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі

Завод імя Варашылава — Шаранговіч, завод «Бальшавік» — Рыскін, завод Камунар» — Жаброўскі, дэпо — Іваноў, завод «Полымя рэвалюцыі» — Чарвякоў, фабрыка «Кастрычнік» — Шпэктараў, мал. рамонт вагонаў — Чарнушэвіч, Абутковая фабрыка — Лычоў, завод «Ударнік» — Казальчук, гута — Ляўкоў (ЦК), шчотачная — Шастакоў («Савецкая Беларусь»), служба эксплёатацыі — Платун (НКА), служба шляху — Ягораў (ЦК), Хэмфармзавод — Цэнцшэр (НК аховы здароўя), завод «Чырвоная зара» — Хэйфец («Рабочай»), фабрыка імя Крупскай — Плешакоў (ЦСПСБ), фабрыка імя 8 сакавіка — Бондар (СНК), Сьпіртазавод — Лойка (Камвуз), Хлебазавод — Саевіч (Гістпарт), завод імя Молатава — Бэнак (СНК), Эльвод — Стракоўскі (УНГУ), друкарня імя Сталіна— Картукоў (ЦК), Мясакомбінат — Герцовіч (ЦК ЛКСМ), кушнерная фабрыка — Айзэнбэрг (БАН), Рымарная фабрыка — Рамапчук (Гістпарт), завод «Чырвоны хімік» — Рудзіцкі (Саўбуд), завод малочнай кіслаты — Абрамсон (МТС), завод «Беларусь» — Гурло (Пэдінстытут), завод «Пралетары» — Эпштэйн (Бімзо), фабрыка «Беларуская» — Любін (заводны камвуз), шпалерная фабрыка — Куханава (ЦКК), «Чырвоны тэкстыльшчык» — Сьвярдлова (ЦКК), лямцавая фабрыка — Трандафілаў, ФЗВ КІМ — Баскін (НКПраны), абутковая майстэрня гарсавету — Авэрын (ЦКК), Упільскур — Шлык (НКЮ), ВЭО — Рыўкін (НКЮ), БСІКО — Баран (БАН), Саюзтранс—Васкабойнікаў (Наркамснаб), Транспартпрэст —Вольскі (БАН), ДЗ-6 — Гофман (Саўбуд), завод стандартных дамоў — Вальфсон (НКА), цагельня № 1—3 — Зэгер (НКЮ), цагельня 2—4 — Матусэвіч (СНК), цагельня № 3 — Красоўскі (СНК), цагельня 5—6 — Серафімаў (БАН), Белдзяржбуд — Балцін (Наркамснаб), Менбуд — Бялуга (НКА), Белжылсаюз — Капаплін (БАН), Дом Ураду — Брагінскі («Зьвязда»), УНР 41 — Лісковіч (ЦК), УНР-18 — Балабанаў (ЦК), 7 дарожная дыстанцыя — Галемшток (ЦВК), Вадаканалтрэст — Герчыкаў (ГК КП(б)Б), 1 грушком будаўнікоў — Лынькоў (Дом Пісьменьніка), міліцыя — Аўчыньнікаў (Камвуз), фабрыка «Камунарка» — Турлай (ЦКК), ВОХР сувязі — Верба (Белкамсаюз), ахова чыгункі — Слонім (НДП), Мантэкстыльпрамсаюз — Бялуга (ЦВК), Гуктранс — Лабадаеў (ЦК), Мясапрамсаюз — Кузьелька (ЦК), Макоўскі і Ошэраў, Ратамскі сельсавет — Сулькоўскі (СНК), Падгайскі с.-с.—Набітко (гарком працасьветы), Прыгарадны сельсавет—Шчадзіскі (БАН), Абчацкі сельсавет—Бобрык (БАН), Замастоцкі сельсавет — Сямёнаў (ЦК), Самахвалавіцкі — Шот (гарком), Сеніцкі сельсавет — Асаўляк (ЦК), Астрашыцкі гаралок — Шлёмін (гарком), Караліпчавіцкі сельсавет — Аўчыньнікаў (Сьвінаводтрэст), Калаўпічанскі сельсавет — Пячонка (гарком), Крупіцкі сельсавет — Іваноў (Гістпарт), Новадворскі сельсавет — Скуман (Бімзо), Грычанскі сельсавет — Улазаў (ЦК), Барадзкі сельсавет — Палей (гарКК), Гатаўскі сельсавет — Бандарын (сувязь), Папярнянскі сельсавет — Жукаў (Бімзо), Строчыцкі сельсавет — Кароль (гарком), Трасьцянецкі сельсавет — Арцямкоў (БАН), Кайкаўскі сельсавет — Масюкоў (НКЗ), 39-ты полк — Нэвель (Камвуз), Падзів № стр. Бел. дыв. — Сурга (БАН), Ракаў (Саўбуд), Галанза (Саўбуд), Валабрынскі (Саўбуд), Малярвіч (ЦП МТС), Гераўкер (ЦСПСБ), Левін (ЦСПСБ), Ермакоў (ЬДУ), Казачок (ЦК). Падзів № кав. дывізіі — Гуровіч (ЦКК), Душец («Акцябр»), Фрумкін (Галоўпартгранс), Гоганд (УМХУ), Клімаў (ЦК), Сэрбэнта (БАН), Шукевіч (Радыёцентр), Засьценкер (ЦК), Дубіна (Сувязь), Брыскін (Усекашрамсавет).

Наступныя таварышы таксама вылучаюцца дакладчыкамі і будуць накіраваны па пуцёўках гаркому КП(б)Б: Альперовіч (Дзяржынлян), Амбражунас (Наркамцяжпрам), Буткевіч (БАН), Багачоў (№ кавкорпус), Багарад (Дзяржынлян), Балабанаў (НКЮ), Бар («Акцябр), Вільчык (ЦК), Выдра (Камвуз), Гімэльфарб (хэмтэхінстытут), Гольдштэйн (Галоўдартгранс), Гінзбург (ЦК), Дрыжынак (АСО), Дамброўскі (ЦКК), Зайчык (НК аховы здароўя), Карначоў (ЦП саюзу маш. буд. рабочых), Кабакоў («Акцябр»), Кац (Наркамлёгпрам), Конюхаў (АБВШ), Клінковіч (ЦСПСБ), Ляхаў (ЦК КОМ), Атінская (Камвуз), Мар'яліна (НКЮ), Маргелаў (БАН), Мароз (НКЛес), Навадворец (Белпедтэхнікум), Окунь (дзяржскі тэатр), Петровіч (Дзяржлян), Розэнгаўз (НК камгас), Розін (НКЛес), Фрыдлянд (ЦК), Хаскін (Белкамсаюз), Цофін (Наркамснаб), Шапіра (Дзяржлян), Шчарбакоў (БАН), Шпраў (ДПУ), Фольдман (Дзяржбанк), Шэрман (Дзяржбанк), Кейлін (Дзяржбанк), Фрадзін (гарком), Дзяніскевіч (гарком), Кролаў (Гістпарт)), Домбаль (БАН), Вітлін (ЦК), Агульнік (Камвуз), Каменштейн (Наркамснаб), Хацкевіч (НКФ), Сьвярдлоў (ЦСПСБ), Шпалавалаў (БАН), Тоцас (НКЮ), Хіліманаў (ЦВК), Галавач (аркамісія пісьменьнікаў), Фішбэйн (газ. «Рабочай»), Шапіра (НКЮ), Ляхаў (НКФ), Клыс (ЦВК), Фрыдман (СНК), Гершэльбаум (БАН).

Усе навучальныя і савецкія ячэйкі павінны самі вылучыць дакладчыкаў і прыслаць на інструкцыйную кансультацыю. Ячэйкі павінны зараз-жа даклавацца з вылучанымі дакладчыкамі наконт часу і месца дакладу. За ўсялякімі пытаньнямі па справе дакладчыкаў зварачацца ў агітмасавы аддзел ГК КП(б)Б (пакой 22, тэл. 14-48) не пазьней 2-га лістапада, пасьля гэтага дня дакладчыкі накіроўваюцца ня будуць. Кансультацыя для дакладчыкаў адбудзецца 22 кастрычніка, а 7 гадз. увечары, у польскім клюбе імя Розы Люксэмбург (рог. Урыцкай і Карла Маркса).

Агітмасавы аддзел ГК КП(б)Б
БАШМАЧНІКАЎ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

КІНО „Чырвоная Зорка"
Ад 29-га кастрычніка
ДВА ГУКАВЫХ ФІЛЬМЫ
ГРАНДЫЁЗНАЯ ПАШЫРАНАЯ ПРАГРАМА
I.
НОВЫ ГУКАВЫ ГАВАРАЧЫ ФІЛЬМ
БЯГЛЕЦ
Рэжысэр В. ПЯТРОЎ.
У ГАЛ. РОЛЯХ: Г. Мічурын, А. Парамонава, А. Кастрычнін.
Аркестр Ленінградзк. філармоніі.
II.
ЛЕПШЫ ГУКАВЫ МУЛЬЦІПЛ. ФІЛЬМ
ПАРАВОЗ, ляці НАПЕРАД
Штодзенна 4 сэансы:
ПАЧЫНАЕЦЬ у 6, 7-30, 9 і 10-30.
КАСА ад 1 гадз. дня.

Інтэрнацыянал — БЕЛЫ АРОЛ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ Кіно-хроніка Саюзкіно
Пралетары — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ЭЛІСО
Дзенныя дзіцячыя сэансы
КІМ ДЗЯЖУРНЫ
„СПАРТАК" Пач.: 7,8-10,9-20, 10-40. Каса—з 5 г.
Выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА
Драма ў 7 частках.

29-X у 7 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Асьветы (Камуністычная, 19)
СКЛІКАЕЦЦА
зьлёт ударнікаў культурнага фронту,
прысьвечаны 15 гадавіне Кастрычн. рэвалюцыі.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклад аб культурным будаўніцтве.
2) Рапарты прадпрыемстваў, калгасаў і культасьветных устаноў.
3) Мастацкая частка.
Запрашаюцца ўсе ўдарнікі рабочыя, калгасьнікі і працаўнікі культпалітусветаноў.
Гарана ГК саюзу Працасьветы.

29-X—32 г. у 7 гадз. вечара, у памяшканьні Менгарсавету (вялікая заля) адбудзецца
зьлёт дэпутатаў і сэкцыянэраў гарсавету.
Яўка абавязкова.
Менгарсавет.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ—

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

ЛІТАРАТУРА ДА 15 ГАДАВІНЫ Кастрычніцкай рэвалюцыі.

НА БЕЛМОВЕ.

ГІСТОРЫЯ І ЗНАЧЭНЬНЕ КАСТРЫЧНІКА.

ЛЕНІН. Аб Кастрычніцкай рэвалюцыі.
БЛЕК-НОТ АГІТАТАРА № 9-10. Аб 15-ай гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ц. 25 к.
ВАЛЬФСОН С. Я. (акад). Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні. (Нацкультбудаўніцтва БССР да 15-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі). Ц. 30 к.
АЛЬБОМ «БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ» — ц. 85 рублёў.
6 ЛЁЗУНГАЎ ДА XV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА. Цана па 10 к.
КІРЫЕНКА. 15 год барацьбы за мір. Ц. 75 кап.
СТАЛІН. Кастрычніцкая рэвалюцыя і тактыка рускіх камуністаў. Ц. 10 к.
МОЛАТАЎ. Кастрычніцкая рэвалюцыя і барацьба за сацыялізм. (Даклады). 10 к.
ГУКОЎСКІ. Антанта і Кастрычніцкая рэвалюцыя—Ц. 1 р. 05 к.
ЛОМАЎ. У дні буры і націску. У Кастрычніку 1917 г. Ц. 15 к.
СТАЛІН. Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму. Ц. 20 к.
СТАЛІН. На шляхах да Кастрычніка. (Артыкулы і прамовы). Ц. 1 р.
АД ГУРТКА да першага зьезду РСДРП. (1893-1898). Ц. 35 к.
БАДАЕЎ. Бальшавікі ў дзяржаўнай думе. Бальшавіцкая фракцыя ў IV дзяржаўнай думе і рэвалюцыйны рух у Пецярбургу). Ц. 1 р. 60 к.
ДУБРОЎСКІ. У панстве нагайкі і шыбеніцы. Сібірская контр-рэвалюцыя ў 1918-1919 г. г. Ц. 40 к.
ЕНУКІДЗЭ. Бальшавіцкія нелегальныя друкарні. Ц. 30 к.
ЛАДАЯНЦ. Ля вытокаў бальшавізму. Заснаваньне РСДРП. Ц. 25 к.
ПАКРОЎСКІ. Імпэрыялістычная вайна. 1914-1918 г. г. Ц. 2 р. 20 к.
ПАКРОЎСКІ. Руская гісторыя ў самым сьціслым нарысе. Ч. I II—Ц. 1 р. ч III—ц. 1 р. 20 к.
У ЭПОХУ РЭАКЦЫІ і новага ўздыму. 1907—1914 г. г.) Ц. 60 к.
ЛЕНІН. Даклад аб рэвалюцыі 1905 г. Ц. 09 к.
ЛЕНІН. Пісьма з далёку. Ц. 30 к.
ЛЕНІН. Збор твораў том IV. (1904-1905 г.г). ц. у калякор. вокл. 2 р. 50 к.
ЛЕНІН. Збор твораў том V. (1905-1906 г. г.). Ц. у калякор. вокл. 2 р. 50 к.
ЛЕНІН. Аб значэньні золата цяпер і пасьля поўнай перамогі сацыялізму. Ц. 10 к.
АРЫСТАВА. 1905 год шлях да Кастрычніка. Ц. 35 к.
ГОРКІ М. 9 студзеня. Ц. 11 к.
ЛЯДАЎ. Партыя бальшавікоў у 1905 г. Ц. 35 к.
ПАКРОЎСКІ. 1905 год. Ц. 45 к.
СТАЛЬ. Перад вялікім пятым годам. Ц. 10 к.
ТЫСЯЧА ДЗЕВЯЦЬСОТ ПЯТЫ ГОД. (Тактыка старых бальшавікоў).—Ц. 65 к.
ЭСЭН. Як складвалася праграма УсеКП(б). Ц. 35 к.

ЛЕНІН АРГАНІЗАТАР КАСТРЫЧНІКА.

БОНЧ-БРУЕВІЧ. Напад на Леніна ў 1919 г. Ц. 12 к.
ВІЛЕНСКІ-СІБІРАКОЎ. Ленін у сібірскай ссылцы. Ц. 05 к.
ГОРКІ М. Ул. І. Ленін. Ц. 20 к.
КРУПСКАЯ. Успаміны пра Леніна. Вып. I. Ц. 55 к.
СОРЫН. Ул. І. Ленін. 1870-1924 г. г. (Кароткая біяграфія). Ц. 30 к.
СТАЛІН. Аб Леніне. Ленін як арганізатар і правадыр РКП. Ц. 67 к.
УЛЬЯНАВА-ЕЛІЗАРАВА. Успаміны пра Ільліча. Ц. 22 к.
ЧАРАЎКОЎ. Ленін. Ц. 15 к.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ І ПОЛЬШЧА.

ЗОРКІ. Сялянская гаспадарка ў фашысцкай Польшчы. Ц. 10 к.
ЛЕНСКІ. Чацьверты год крызісу ў Польшчы. Ц. 20 к.
ЛІМАНОЎСКІ. Становішча і барацьба рабочай моладзі ў Польшчы. Ц. 65 к.
БЕЛАВАНДЫТЫ за работай. (Зборнік). Ц. 35 к.
БОГЭН. Заходняя Беларусь пад крывавым кнутом польскіх акупантаў. Ц. 03 к.
ВІСЛІЦКІ. Польшча. (Клясы, партыі і саюзы моладзі сьвету). Ц. 15 к.
ВОЛЬСКІ. Як жыве і змагаецца польскі рабочы. Ц. 25 к.
ПОЛЬСКАЯ КАМСАМОЛКА. Лісты на волю Ц. 60 к.
ГУРНІК Я. Пятля на шыі польскага гарнчака сьвяшчэнца. Ц. 45 к.
ДАНІШЭЎСКІ. Жыцьцё і барацьба польскага пралетарыяту. Ц. 10 к.
У ФАШЫЦКАЙ ПОЛЬШЫ. (Зборнік). Ц. 20 к.
ЯКАЎЛЕЎ. Заходняя Беларусь. Ц. 35 к.

ДВА СЬВЕТЫ, ДЗЬВЕ СЫСТЭМЫ.

ІНГУЛАЎ. Два сьветы—дзьве сыстэмы. Ц. 30 к.
ПЯСТУН. У нас і ў іх. (Што бачылі іваначскія ўдарнікі за-граніцай). Ц. 10 к.
РУБІНШТЭЙН. Сусьветны эканамічны крызіс капіталізму. Ц. 85 к.
СТАЛЬНЫ. Сусьветны эканамічны крызіс і імпэрыялізм на Далёкім Усходзе. Ц. 40 к.
БУДЗІН. Контр-рэвалюцыйны меншавізм на службе інтэрвэнцыі. Ц. 70 к.
ВАЛЫНСКІ. Антысавецкі саюз шасьці. (Францыя і яе саюзьнікі). Ц. 25 к.
ГОРКІ. М. Будзем на варце. (Артыкулы). Ц. 70 к.
ГОРКІ М. і РАМЭН РАЛЯН выкрываюць інтэрвэнтаў. Ц. 10 к.
ДАШЫНСКІ. Японія ў Манчжурыі. Ц. 23 к.
КАШЭН М. Францускі імпэрыялізм рыхтуе вайну супроць СССР. Ц. 10 к.
ЛІТВІНАЎ. Народы чакаюць разьбраньня. (Прамовы на Жэнэўскай канфэрэнцыі). Ц. 15 к.
МІНСКІ. Сацыял-фашысты пры ўладзе. Ц. 90 к.
ЭЙДЭ І. Ачагі нацыянальнай барацьбы ў Эўропе. Ц. 60 к.
ГАЕК Р. Жыцьцё і барацьба чэха-славацкіх рабочых. Ц. 10 к.
ДЖЭРМАНЭТО. Італія. як яна ёсьць. Ц. 30 к.
ДЗІКЕН. Як жывецца пралетарыяту ў Англіі. Ц. 07 к.
ЗАВАДЗКІ. Як жыве і змагаецца францускі пралетарыят. Ц. 16 к.
ІВІН А. Барацьба за Савецкі Кітай. Ц. 65 к.
ІЗАКАЎ. Сучаснае нівольніцтва ў калёніях і паўкалёніях. Ц. 40 к.
МАХАМЭД Алі. Пралетарыят Індыі. Ц. 20 к.
ПАЭГЛЕ. Змаганьне работніц капіталістычных краін супроць вайны. 15 к.
ПЭДМОР. Негры пад прыгнётам імпэрыялізму. Ц. 20 к.
СЭВІН. Гішпанія. (Клясы, партыі і саюзы моладзі сьвету). Ц. 35 к.
СЭВІН. Паўднёвая Амэрыка. (Клясы, партыі і саюзы моладзі сьвету). 60 к.
СЭВІН. Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты. (Клясы, партыі і саюзы моладзі сьвету). Ц. 55 к.

АБАРОНА КРАІНЫ і ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ.

БРОНІН Я. Ленін і Чырвоная армія. Ц. 10 к.
ВАРАШЫЛАЎ К. Сталін і Чырвоная армія. Ц. 05 к.
АДАМОВІЧ. Прызыў у РСЧА—адказная палітычная кампанія. Ц. 10 к.
БАЗЬ. Чаму мы перамаглі ў грамадзянскай вайне. Ц. 60 к.
ВЕРЫЧАЎ. Сродкі і спосабы паветрана-хімічнага нападу і абароны. Ц. 1 р. 20 к.
ВЕСЯЛОЎСКІ. Японія і яе ўзброеныя сілы. Ц. 50 к.
ГОЛУБЕЎ. М. В. Фрунзэ пра характар будучай вайны. Ц. 80 к.
ГЕЛЬЯНАЎ і ЯНАЎ. Новыя задачы шэфства над флётам. Ц. 30 к.
ЗАРЭАР В. Даёш савецкія дырыжаблі. Ц. 10 к.
КУДЗІНАЎ. Ваенная небяспека і задачы абароны СССР. Ц. 40 к.
МЭЗІТ. Тэхніка ў будучай вайне. Ц. 55 к.
ТУЛЬСКІ. Манчжурыя. Ц. 40 к.
ХАРЫТОНАЎ. Чырвоная армія—варты савецтаў. Ц. 05 к.
ХРЫНІН. Паветраны флёт. Ваенна-палітычны агляд арганізацыі, узбраеньня і ўзмоцненьня. Ц. 70 к.
ШМІДТ. Хэмічная вайна і першая дапамога пры параженьнях атрутнымі матэрыямі. Ц. 40 к.
ЯК РОБІЦЦА ВАЙНА. Зборнік артыкулаў. Ц. 40 к.

ПАРТБУДАЎНІЦТВА. НАЦПЫТАНЬНЕ. ДРУК. КАМСАМОЛ.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАНЬНЕ. Зборнік оклаў Будзін. Ц. 2 р. 70 к.
ГАНДУЛЬ. XVI зьезд УсеКП(б) аб росьце партыі. Ц. 10 к.
ГІЛІНСКІ. Партячэйка на гаспадарчым фронце. Ц. 25 к.
ГІСТОРЫЯ камуністычнага інтэрнацыяналу ў капрэсах. Ц. 1 р. 65 к.
ДЗЯЦІНА С. За перабудову партработы. Ц. 20 к.
ЖАБРОЎСКІ. Чарговыя задачы арганізацыйна-партыйна-масавай і палітычна-выхаваўчай работы партыі. Ц. 25 к.
ЗБОРНІК пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб калгаснай ячэйцы. Ц. 15 к.
КАГАНОВІЧ і інш. Чарговыя задачы партыйна-масавай работы. Ц. 15 к.
КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ — авангард пралетарыяту. Ц. 60 к.
ЛЫСАКОЎ П. Партработа ў цэху. Ц. 20 к.
ЛЮСТЫШАЎ. Аб рабоце калгасных ячэек і кіраўніцтва імі. Ц. 15 к.
ПОСТЫШНАЎ. За марксыцка-ленінскае выхаваньне. Ц. 30 к.
ПРАГРАМА Камуністычнага інтэрнацыяналу. Ц. 20 к.
РЭЗАЛЮЦЫІ XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі. Ц. 15 к.
РЭЗАЛЮЦЫІ XIV зьезду КП(б)Б. Ц. 20 к.
ШАРАНГОВІЧ. Вынікі ліненьскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Ц. 10 к.
ЛЕНІН У. І. Задачы саюзу моладзі. Ц. 10 к.
СТАЛІН. Аб камсамоле. Ц. 20 к.
ПРОСЭЮ. Рабочая моладзь у забастовачным змаганьні. Ц. 30 к.
ГЕНРЫ ДЖОН. Рабочая моладзь у краіне дазяраў. Ц. 36 к.
ЖАБРОЎСКІ. Чарговыя задачы работы камсамольскай арганізацыі Беларусі. Ц. 20 к.
КНЯЗЕЎ. Камсамол на самалёт. Ц. 25 к.
КОСАРАЎ А. Камсамол у рэканструкцыйны пэрыяд. Ц. 85 к.
ЛІМАНОЎСКІ. Становішча і барацьба рабочай моладзі ў Польшчы. 65 к.
ПОЛЬСКАЯ КОМСАМОЛКА. Лісты на волю. Ц. 60 к.
ПОСТЫШАЎ. За бальшавіцкае выхаваньне новых кадраў камсамолу. 15 к.
ПРАГРАМА Камуністычнага інтэрнацыяналу моладзі. Ц. 25 к.
ПЭЧЭ Я. Рабочая моладзь у падпольлі. Ц. 15 к.
РАСТАЎЦОЎ А. Змаганьне за моладзь у капіталістычных краінах. Ц. 35 к.
СТАТУТ Усесаюзнага Ленінскага Камсамолу. Ц. 10 к.
БУДЗІНСКІ С. і КУРЦІК А. Друк самая вострая, самая моцная зброя партыі. Ц. 95 к.
ЗАДАЧЫ бальшавіцкага друку. Ц. 20 к.

ПА-НОВАМУ ПРАЦАВАЦЬ. Пастановы Усесаюзнай нарады пры «Правдзе» па пытаньнях рабселькораўскага руху. Ц. 1 р. пер. 20 к.
ПАД СЬЦЯГАМ УДАРНІЦТВА. Рабселькоры ўдарнікі на трыбуне. Ц. 32 к.
УДАРНІКАМ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ. Важнейшыя пастановы па пытаньнях рабселькораўскага руху і ўдарніцтва ў друку. Ц. 30 к.
ШАРАНГОВІЧ і інш. Тэмы рашаюць. Стэнограмы дакладаў на Усебеларускай нарадзе рэдактароў. Ц. 45 к.
АБОРЫН А. Нацыянальнае пытаньне ў СССР. Ц. 15 к.
ПАПОЎ Н. Н. Кастрычніцкая рэвалюцыя і нацыянальнае пытаньне. Ц. 20 к.
ПАСТАНОВЫ і рэзалюцыі УсеКП(б)Б і КП(б)Б па нацпытаньні. Ц. 30 к.
СКРЫПНІК Н. Нацыянальнае пытаньне ў праграме Камінтэрну. Ц. 32 к.
СТАЛІН. І. В. Выбраныя работы па нацыянальным пытаньні. Ц. 60 к.
ЗЮЗЬКОЎ А. Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі. Ц. 35 к.
СУПРОЦЬ контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму. Ц. 50 к.
ЧАРНУШЭВІЧ А. Беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм.

САЦБУДАЎНІЦТВА. КУЛЬТБУДАЎНІЦТВА. АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ.

СТАЛІН. Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва. Ц. 25 к.
АРСКІ. Урал і Кузбас у змаганьні за сацыялізм. Ц. 25 к.
ВОЛКАВА. Гомсельмаш. Ц. 40 к.
КРУПЫНСКІ. Аповесьць пра Турксіб. Ц. 60 к.
МІСЛАЎСКІ. Дняпрабуд. Ц. 15 к.
МІСЛАЎСКІ. Магнітагорск. Ц. 30 к.
АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ БССР. Пастанова СНК КП(б)Б і ЦК КП(б)Б. Ц. 07 к.
АРГАНІЗУЕМ СУСТРЭЧУ ПЯЦІГОДКІ пабудовай сацыялізму. Ц.
ДЫРЭКТЫВЫ да складаньні другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі БССР. (1933-1937 г. г.). Ц. 30 к.
КОСАРАЎ і САЛТАНАЎ. На рубяжы двух пяцігодак. (Даклады і рэзалюцыі). Ц. 40 к.
ЛЯОНЦЬЦЕЎ. Другая пяцігодка. Ц. 20 к.
МОЛАТАЎ і КУЙБЫШАЎ аб другой пяцігодцы. Ц. 87 к.
МОХЛІС. Клясавая барацьба ў другой пяцігодцы. Ц. 25 к.
НА ПОДСТУПАХ другой пяцігодкі. Ц. 35 к.
БРАНДАБОЎСКІ С. і інш. Усебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту. Ц. 40 к.
КАНАПЛІН М. Гарсаветы БССР на шляхох перабудовы сваёй работы. Ц. 45 к.
ЛОДЫСЕЎ С. Райвыканкомы і сельсаветы. Ц. 40 к.
МІРОПНІКАЎ І. Крадытная рэформа і гаспадарчы разрахунак. Ц.
ПАМЯТКА інфарматару РВК і інфармантыву сельскіх саветаў. Ц. 10 к.
ПАМЯТКА ўдарніку фінансавага фронту. Ц. 05 к.
РАКАЎ. Шляхі рацыяналізацыі дзяржапарату. Ц. 85 к.
РУДЗІНСКІ Л. Саветы і сацыялістычнае наступленьне. Ц. 20 к.
ХАЦКЕВІЧ А. Фінансавы плян і бюджэт БССР на 1932 г. Ц. 35 к.
ХІМАНАЎ. Гарсаветы аб масавай рабоце. Ц. 30 к.
ГАЛАДЗЕД М. Барацьба за індустрыялізацыю і калектывізацыю БССР. Ц. 10 к.
КАЎФМАН Л. Рушыць наперад лёгкую прамысловасьць. Ц. 15 к.
ЛАЎЭР Г. За 17.000.000 тон чыгуну. Ц. 17 к.
МІКАЯН А. Харчовае забесьпячэньне і нашы задачы. Ц. 27 к.
ПАЎШЧЫНСКІ. Грамадзкае харчаваньне на службе індустрыялізацыі. Ц. 75 к.
МАГІД А. і БРАЎНШТЭЙН В. Энтузіясты прыпаўку. Ц. 15 к.
СОКАЛАЎ. Прамкаапэрацыя і барацьба на два фронты. Ц. 15 к.
СОКАЛАЎ К. Спажывецкая кааперацыя ад казвае за выкананьне прамфінпляну. Ц. 10 к.
КАЛІНІН. Аб савецкім гандлі. Ц. 10 к.
НОДЭЛЬ В. Калгасны гандаль на службу будаўніцтва сацыялізму. Ц. 25 к.
САРКІЗ. Аб савецкім гандлі на сучасным этапе. Ц. 10 к.
АБ КУЛЬТУРНЫМ будаўніцтве БССР. Ц. 10 к.
ЗБОРНІК дырэктыў па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе (ДВС). Ц. 20 к.
ПАПОЎ. За культурную рэвалюцыю. Ц. 10 к.

ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ. ПРАФРУХ І ПРАЦА.

СТАЛІН. Аб тэхніцы. Ц. 20 к.
АСІНСКІ П. Тэхніка і рабочая клясa. Ц. 35 к.
БУРДЗЯНСКІ. Асновы рацыяналізацыі вытворчасьці.
БУРДЗЯНСКІ. Шляхі бальшавіцкага аўладаньня тэхнікай.
ГРЫНБЭРГ. Тэхнічны бой. Ц. 14 к.
ЛЯШОВІЧ В. Парады маладому тэхніку. Ц. 35 к.
ПЯТРОЎСКІ Д. У змаганьні за новыя тэхнічныя кадры.
ПЯТУХОЎ М. За ўсеагульнае тэхнічнае навучаньне ўдарнікаў. Ц. 10 к.
РУБІНЧЫК М. Балявыя задачы тэхнічнай прапаганды. Ц. 30 к.
РУБІНШТЭЙН М. Навука, тэхніка і эканоміка ў Савецкім саюзе і ў капіталістычных краінах. Ц. 35 к.
РУЗАЎ. Камсамол за аўладаньне тэхнікай. Ц. 15 к.
БАЖАНАВА З. Новае ў рабоце вытворчых нарад. Ц. 15 к.
БАТУРСКІ Г. Вытворчыя нарады ў прамкааперацыі. Ц. 30 к.
БРАДОЦКІ Б. Сьцяганосцы. (Кніга нарысаў). Ц. 60 к.
БРОЎЧАНКА Г. Новыя шляхі вытворчых нарад. Ц. 10 к.
БУРДЗЯНЕЎ і інш. За бальшавіцкую рацыяналізацыю. Ц. 60 к.
ВІКІН. На змаганьне за якасьць прадукцыі. Ц. 15 к.
ГАЛАЎНЕЎ і інш. Брыгадна-гаспадарчы разрахунак у прамысловасьці. Ц. 75 к.
ДАНІЛЕВІЧ. Рацыяналізацыя і змаганьне са стратамі на вытворчасьці. Ц. 30 к.
ЖЭЛЯЗНОЎ А. Брыгада на гаспадарчым разрахунку. Ц. 10 к.
ЛЕЙБМАН. 6 умоў т. Сталіна—гарантыя перамог. Ц.
ЛЕНІН У. І. Аб працоўнай дысцыпліне. Ц. 20 к.
ПАЎЛАЎ А. За сацыялістычную арганізацыю працы. Ц. 30 к.
ПЕРВЕНЦЫ ПЯЦІГОДКІ. Ц. 65 к.
САВІЧАЎ. Як арганізаваць ударную брыгаду. Ц. 05 к.
ВЭЙНБЭРГ Г. Прафсаюзы і шэсьць умоў т. Сталіна. Ц. 25 к.
ДА НОВЫХ БАЁЎ. Рэзалюцыі і пастановы V кангрэсу Прафінтэрну. Ц. 75 к.
Дубровскі П. і ПАЎЛЮЧЭНКА К. Абарона краіны і задачы прафсаюзаў. Ц. 25 к.
ЮЛАТАЎ В. IX Усесаюзны зьезд прафсаюзаў. Ц. 10 к.
РУДЗУТАК Я. За павышэньне прадукцыі нашай працы. Ц. 10 к.

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА.

БРОЎКА. Календры. Ц. 1 р. 05 к. пер. 15 к.
БЯДУЛЯ. Салавей. Ц. 1 р. 50 к. пер. 14 к.
ГАЛАВАЧ. Спалох на заганах. Ц. 75 к.
ГАРБУНОЎ. Ледалом. Ц. 80 к.
ГЛАДКОЎ. Цэмэнт. Ц. 1 р. 10 к.
ГЛЕБКА. Арлянка. Ц. 2 р. 70 к. пер. 30 к.
ДАЎГАПОЛЬСКІ. Каля адчыненай брамы. Ц. 1 р. 10 к.
ЗАЛКА. Аповесьць аб вечным міры. Ц. 65 к.
ЗАРЭЧНЫ. Паэма пра геройства. Ц. 15 к.
КАВАЛЬ. Выбраныя навэлы. Ц. 1 р. 20 к. пер. 25 к.
КАЗЛОЎСКІ. Музыка працы. Ц. 1 р. 70 к.
КОЛАС. Адпачаненец. Ц. 1 р. 25 к.
ЛЕБЯДЗІНСКІ. Камісары. Ц. 1 р. 15 к.
ЛІМАНОЎСКІ. Над абрывам. (II выд.). Ц. 2 р. 30 к. пер. 30 к.
ЛЫНЬКОЎ. Андрэй лятун. (Выд. II). Ц. 1 р.
МІКІТЭНКА. Буркаганы. Ц. 1 р. 50 к. пер. 25 к.
МУРАШКА. Званкі. Ц. 55 к.
МЯЖЭВІЧ. Шляхам героў. Ц. 60 к.
СКРЫГАН. Каня Бапякова. Ц. 20 к.
СТАПЮЎСКІ. Пад местачковым месяцам Ц. 1 р.
СТАЎСКІ. Разьбет. Ц. 1 р. 20 к.
УДАРНІКІ № 1 (№ 2 друкуецца). Ц. 75 к.
ФАДЗЕЕЎ. Разгром. Ц. 1 р. 10 к.
ФУРМАНАЎ. Чапаў. Ц. 1 р. 80 кап. пер. 30 к.
ФУРМАНАЎ. Чырвоны десант. Ц. 20 к.
ЧОРНЫ К. Бацькаўшчына. Ц. 1 р. 25 к. пер. 55 к.
ЭЙНК. Сустрэча. Ц. 30 к.
АЛЕКСАНДРОВІЧ. Творы. том I.
АЛЕКСАНДРОВІЧ. Нараджэньне чалавека. Ц. 1 р. 30 к.
АЛЕКСАНДРОВІЧ. Цені на сонцы. Ц. 50 к.
БРОЎКА. Паэзія. (Рыхтуецца да друку).
КУПАЛА Я. Том VI. Ц. 5 р.
ЛІХАДЗІЕЎСКІ. Мы—маладая гвардыя. Ц. 1 р. 15 к.
ЛУЖАНІН. Першамайская вуліца. Ц. 1 р. 60 кап.
ПАЛІШЧУК. Лекін. Ц. 50 к.
САДАГУБ. Лукішкі. Ц. 50 к.
ТАЎБІН. Мая другая кніга вершаў. Ц. 80 к.
ЧАРОТ. Боская на вотшчыны. Ц. 40 к.
ЧАРОТ. Паэзія. Ц. 1 р. 25 к.
ЧУРКІН. Крышыцца лёд. Ц. 45 к.
БЛІСЬЦІНАЎ. Агні Палесься. Ц. 80 к.

ЮНАЦКА-ДЗІЦЯЧАЯ.

УЛЬЯНАВА-ЕЛІЗАРАВА. Успаміны пра Ільліча. Ц. 22 к.
ГУТМАН. Наўлоўная дзікарня. Ц. 90 к.